Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

Факультэт пачатковай адукацыі
Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства
(рэг. № ЗО-27-3-187-2025)

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
беларускага і рускага мовазнаўства
__________ Н.М.Антановіч
22 мая 2025 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
пачатковай адукацыі
__________ Н.У.Ждановіч
28 мая 2025 г.

# ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

для спецыяльнасці 6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя

Складальнік: Свірыдзенка В. І., кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета БДПУ 29.05.2025.
Пратакол № 9

# ЗМЕСТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........................................ 4
ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................ 5
Лекцыйныя заняткі № 1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука ........................................ 5
Лекцыйныя заняткі № 2. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі ........................................ 6
Лекцыйныя заняткі № 3. Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі ........................................ 8
Лекцыйныя заняткі № 4. Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння ........................................ 9
Лекцыйныя заняткі № 5. Методыка вывучэння марфалогіі ........................................ 11
Лекцыйныя заняткі № 6. Методыка навучання арфаграфіі ........................................ 12
Лекцыйныя заняткі № 7. Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах ... 15
Лекцыйныя заняткі КСР. Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі ........................................ 18
ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ........................................ 19
Практычныя заняткі № 1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука ........................................ 19
Практычныя заняткі № 2. Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання ........................................ 19
Практычныя заняткі № 3. Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах 20
Практычныя заняткі № 4. Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі ........................................ 21
Практычныя заняткі № 5. Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання ........................................ 22
Практычныя заняткі № 6. Урок беларускай мовы ........................................ 23
Практычныя заняткі № 7. Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы .... 24
Практычныя заняткі № 8. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі ........................................ 25
Практычныя заняткі № 9. Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі ........................................ 26
Практычныя заняткі № 10. Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння ........................................ 27
Практычныя заняткі № 11. Методыка вывучэння марфалогіі ........................................ 28
Практычныя заняткі № 12. Методыка навучання арфаграфіі ........................................ 29
Практычныя заняткі № 13. Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах ........................................ 29
Практычныя заняткі КСР. ........................................ 31
Тэма: Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы ........................................ 31
Тэма: Методыка вывучэння марфалогіі ........................................ 31
Тэма: Методыка навучання арфаграфіі ........................................ 32

Лабараторныя заняткі № 1. Урок беларускай мовы ........ 33
Лабараторныя заняткі № 2. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі ........ 33
Лабараторныя заняткі № 3. Методыка вывучэння марфалогіі ........ 34
РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ........ 35
ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ........ 38
Вучэбная праграма ........ 38
Спіс рэкамендаванай літаратуры ........ 94

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў, здольных забяспечыць гуманітарнае развіццё асобы, з'яўляюцца надзвычай актуальнымі ў сучасных сацыякультурных умовах. Менавіта таму будучага настаўніка пачатковых класаў важна ўзброіць ведамі і ўменнямі, неабходнымі для фарміравання ў навучэнцаў базавых моўных ведаў, каштоўнасных адносін да беларускай мовы, маўленча-камунікатыўных і агульнавучэбных уменняў і навыкаў, пазнаваўчага інтарэсу, маральна-этычных якасцей, звязаных з захаваннем правіл і прынцыпаў зносін. Электронны вучэбна-метадычны комплекс мае на мэце садзейнічаць набыццю студэнтамі тэарэтычных ведаў і практычных уменняў арганізацыі працэсу моўнай адукацыі ў пачатковых класах, кіравання пазнавальнай і камунікатыўнай дзейнасцю навучэнцаў на ўроках беларускай мовы.

У склад электроннага вучэбна-метадычнага комплексу ўключаны наступныя раздзелы: тэарэтычны (тэматыка і план лекцый, азначэнні асноўных паняццяў і катэгорый, пералік пытанняў для самастойнага разгляду), практычны (матэрыялы практычных і лабараторных заняткаў; заданні для кіруемай самастойнай работы студэнтаў), кантролю ведаў (пытанні да экзамену), дапаможны (вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя; пералік вучэбных выданняў, рэкамендаваных для вывучэння дысцыпліны).

У тэарэтычным раздзеле звернута ўвага на такія важныя паняцці лінгваметодыкі як падыходы да навучання, заканамернасці авалодання мовай, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння розных раздзелаў курса беларускай мовы, эфектыўныя метады і прыёмы навучання асновам фанетыкі і графікі, элементам лексікалогіі, марфемнаму складу слова і элементам словаўтварэння, марфалогіі, арфаграфіі, сінтаксісу і пунктуацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Прыведзены пералік заданняў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па тэме лекцыйных заняткаў «Мэты і змест моўнай адукацыі».

У практычным раздзеле прадстаўлены пытанні для разгляду і абмеркавання на практычных і лабараторных занятках, заданні, звязаныя з аналізам вучэбных праграм і падручнікаў, з распрацоўкай фрагментаў і канспектаў урокаў па беларускай мове ў пачатковых класах. Там жа змешчаны матэрыялы, якія дапамогуць арганізаваць самастойную работу студэнтаў і сфарміраваць у іх прафесійна-метадычныя ўменні ў арганізацыі працэсу моўнай адукацыі.

Раздзел кантролю ведаў утрымлівае матэрыялы, якія дапамогуць студэнтам дзённай і завочнай форм атрымання адукацыі падрыхтавацца да прамежкавай атэстацыі.

Дапаможны раздзел змяшчае вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай мовы» і пералік літаратурных крыніц, якія могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы да лекцыйных, практычных і лабараторных заняткаў.

# ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Лекцыйныя заняткі № 1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука

**План лекцыі**

***1. Прадмет, змест, задачы, фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі выкладання беларускай мовы.***

***2. Сувязь методыкі беларускай мовы з іншымі навукамі.***

***3. Метады даследавання ў методыцы выкладання беларускай мовы.***

1. *Прадмет методыкі выкладання беларускай мовы* – працэс навучання школьнікаў мове (*распрацоўка тэхналогіі навучання*) і даследаванне заканамернасцяў засваення мовы.

*Змест методыкі пачатковага навучання беларускай мове:*

- Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі.
- Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі.
- Методыка вывучэння марфемнага складу слова.
- Методыка вывучэння элементаў марфалогіі.
- Методыка вывучэння элементаў сінтаксісу і пунктуацыі.
- Асаблівасці вывучэння беларускай мовы ў школах з рускай мовай навучання.

*Фундаментальныя паняцці і катэгорыі методыкі выкладання беларускай мовы:* мэты і змест моўнай адукацыі, падыходы да навучання, заканамернасці авалодання мовай, прынцыпы навучання, метады, прыёмы і формы навучання, адукацыйныя тэхналогіі.

**2.** Тэарэтычнымі асновамі методыкі мовы з'яўляюцца філасофія, логіка, лінгвістыка, педагогіка, псіхалогія.

Філасофія забяспечвае метадалагічныя асновы методыкі, разуменне мэт і задач навучання мове.

Логіка прадвызначае шляхі фарміравання лінгвістычных паняццяў.

Лінгвістыка дапамагае вызначыць змест школьнага курса беларускай мовы.

Дыдактыка вызначае асноўныя заканамернасці працэсу навучання беларускай мове.

Узроставая псіхалогія раскрывае псіхалагічныя асаблівасці малодшых школьнікаў, асаблівасці іх мыслення, памяці, успрымання, уяўлення. Педагагічная псіхалогія даследуе працэс фарміравання пазнавальнай дзейнасці, засваення ведаў, уменняў і навыкаў, фарміравання асобы вучня.

**3.** Методыка выкладання беларускай мовы мае сваю тэхналогію даследавання, свае метады.

**Структура педагагічнага даследавання.**

- Вызначэнне актуальнай праблемы, аб’екта і прадмета даследавання.
- Фармулёўка гіпотэзы, абгрунтаванне канцэпцыі.
- Распрацоўка методыкі.
- Правядзенне эксперыменту.
- Аналіз вынікаў.
- Вывады.

**Метады даследавання:**

- метады тэарэтычнага пошуку;
- метады даследавання педагагічнага працэсу;
- эксперымент (пошукавы, канстатуючы, навучальны, кантрольны);
- метады матэматычнай статыстыкі.

**Літаратура**

1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

## Лекцыйныя заняткі № 2. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі

**План лекцыі**

1. ***Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі.***
2. ***Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі.***
3. ***Задачы і змест вывучэння раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе.***
4. ***Метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі.***

***1.*** Работа па фарміраванні ў вучняў фанетычных і графічных ведаў, уменняў і навыкаў – найважнейшая часткай пачатковага курса мовы. Ад яе паспяховасці залежыць узровень культуры вуснага і пісьмовага маўлення навучэнцаў.

Фанетычныя веды складаюць аснову правільнага вымаўлення слоў; без апоры на фанетычныя веды немагчыма выпрацаваць арфаграфічныя ўменні і навыкі; фанетычныя веды неабходныя для свядомага інтанавання сказаў;

веданне гукавога складу слова неабходна для ўсведамлення яго лексічнага значэння.

**2.** Вывучэння асноў фанетыкі і графікі павінна абапірацца на наступныя *прыватнаметадычныя прынцыпы*:

- апора на фанематычны слых саміх вучняў;
- разгляд гука ў марфеме;
- супастаўленне гукаў і літар.

**3.** *Задачы вывучэння раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе.*

- Фарміраванне першапачатковых ведаў пра фанетычную сістэму беларускай мовы.
- Засваенне арфаэпічных нормаў беларускай мовы.
- Засваенне асаблівасцей беларускай графікі.
- Фарміраванне арфаграфічных навыкаў.

Пры вывучэнні раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе навучэнцы набываюць фанетычныя і графіка-арфаграфічныя веды, у вучняў фарміруюцца фанетычныя, арфаэпічныя, графіка-арфаграфічныя ўменні.

**4.** Асноўнымі метадамі ўдасканалення артыкуляцыйнага навыку і фанематычнага слыху навучэнцаў з’яўляюцца *актыўнае слуханне і імітацыя.*

Пры станаўленні вымаўленчых навыкаў чаргуюцца харавая і індывідуальная формы работы.

Слыхавыя і вымаўленчыя навыкі ўдасканальваюцца праз чытанне ўслых, выкананне фанетычных зарадак.

Пры арганізацыі работы над фанетычнымі з’явамі ў пачатковых класах актыўна выкарыстоўваецца прыём супрацьпастаўлення.

Акрамя таго, шырока прымяняюцца *аналітычныя* і *рэпрадуктыўныя* фанетычныя практыкаванні.

Як практыкаванне аналітычнага характару выступае фанетычны разбор у дзвюх яго разнавіднасцях – гукавы і гука-літарны.

**Літаратура**


1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. План-канспект урокаў. 2 клас / В. І. Свірыдзенка. – Мінск: Аверсэв, 2022. – 272 с.

## Лекцыйныя заняткі № 3. Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі

**План лекцыі**

**1.** ***Значэнне вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.***

***2. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі.***

***3. Задачы і змест вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах.***

***4. Метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі.***

**1.** У працэсе засваення значэнняў слоў вучні ўсведамляюць паняцці, уласцівыя роднай мове.

Дакладнае веданне лексічнага значэння слова – важная ўмова фарміравання граматычных і арфаграфічных навыкаў.

Пры вывучэнні элементаў лексікалогіі адбываецца мэтанакіраванае ўзбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў.

**2.** Вывучэння элементаў лексікалогіі павінна абапірацца на наступныя *прыватнаметадычныя прынцыпы*:

- сістэмны;
- кантэкстны;
- лексіка-граматычны;
- функцыянальна-семантычны;
- тэматычны.

**3.** *Задачы вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах.*

- Фарміраванне першапачатковых ведаў пра лексічную сістэму беларускай мовы.
- Узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу навучэнцаў.
- Выпрацоўка ўменняў працы з тлумачальным слоўнікам.

Пры вывучэнні тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах навучэнцы набываюць першапачатковыя лексічныя веды, у вучняў фарміруюцца лексічныя ўменні.

**4.** Асноўны метад працы пры вывучэнні элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах – метад практыкаванняў. Лексічныя практыкаванні накіраваны на ўсведамленне сутнасці лексікалагічных паняццяў і на фарміраванне лексічных уменняў.

Пры вывучэнні тэмы «Значэнне слова» шырока выкарыстоўваюцца наглядныя метады. Славесная нагляднасць прымяняецца для арганізацыі назіранняў над выкарыстаннем лексічных з’яў у кантэксце, для развіцця цікавасці да незнаёмых слоў. Зрокавая нагляднасць выкарыстоўваецца для тлумачэння значэнняў незразумелых слоў, размежавання розных значэнняў

мнагазначных слоў, стварэння выказванняў вучняў з выкарыстаннем пэўных лексем.

**Літаратура**

1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. План-канспект урокаў. 2 клас / В. І. Свірыдзенка. – Мінск: Аверсэв, 2022. – 272 с.
5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.

## Лекцыйныя заняткі № 4. Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння

**План лекцыі**

1. ***Значэнне вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.***
2. ***Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова.***
3. ***Задачы і змест вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.***
4. ***Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова.***

**1.** Пры знаёмстве з марфемным складам слоў навучэнцы авалодваюць адным са спосабаў раскрыцця лексічнага значэння слоў; усведамляюць асноўную крыніцу папаўнення мовы новымі словамі; пашыраюць веды пра навакольны свет; авалодваюць уменнямі дакладна ўжываць у маўленні словы рознай марфемнай будовы; набываюць веды і ўменні, неабходныя для фарміравання навыкаў правапісу марфем; развіваюць разумовыя здольнасці.

**2.** Вывучэнне марфемнага складу слова павінна абапірацца на наступныя *прыватнаметадычныя прынцыпы*:

- структурна-словаўтваральны;
- лексіка-словаўтваральны;

- матывацыйны.

**3.** *Задачы вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.*

- Фарміраванне першапачатковых ведаў па марфеміцы.
- Падрыхтоўка вучняў да разумення асаблівасцей утварэння назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў.
- Развіццё ўяўленняў пра ўзаемасувязь паміж лексічным значэннем слова і яго марфемным складам.
- Выпрацоўка навыкаў правапісу марфем.
- Развіццё разумовых здольнасцей навучэнцаў.

Пры вывучэнні тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах навучэнцы набываюць першапачатковыя веды па марфеміцы і правапісе марфем, у вучняў фарміруюцца аналітыка-сінтэтычныя і арфаграфічныя ўменні.

**4.** Пры вывучэнні марфемнага складу слова выкарыстоўваюцца наступныя метады працы: паведамленне настаўніка, эўрыстычная гутарка, моўны аналіз (марфемны, частковы словаўтваральны), моўнае канструяванне (складанне слоў з прапанаваных марфем; складанне гнёздаў аднакаранёвых слоў; утварэнне форм слоў), наглядныя метады, метад практыкаванняў.

Сярод практыкаванняў найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца размежаванне форм слоў і аднакаранёвых слоў, групоўка слоў, лексіка-словаўтваральны аналіз тэксту, замена разгорнутага тлумачэння лексічнага значэння слова падборам роднаснага слова; складанне сказаў з аднакаранёвымі словамі; словаўтваральныя заданні.

**Літаратура**

1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.
5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.

## Лекцыйныя заняткі № 5. Методыка вывучэння марфалогіі

**План лекцыі**

1. ***Значэнне вывучэння марфалогіі.***
2. ***Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі.***
3. ***Задачы і змест вывучэння тэмы «Часціны мовы» ў пачатковых класах.***
4. ***Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі.***

**1.** Без выпрацоўкі ўменняў адносіць словы да пэўнай часціны мовы, змяняць іх немагчыма сфарміраваць граматычны лад маўлення навучэнцаў, развіць іх арфаграфічную пісьменнасць. Вывучэнне часцін мовы спрыяе ўзбагачэнню і ўдакладненню слоўніка вучняў, фарміраванню іх маўленчай культуры. Вывучэнне марфалогіі садзейнічае кагнітыўнаму развіццю асобы.

**2.** Вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах павінна абапірацца на наступныя *прыватнаметадычныя прынцыпы*:

- лексіка-граматычны;
- парадыгматычны;
- марфолага-сінтаксічны.

**3.** *Задачы вывучэння тэмы «Часціны мовы» ў пачатковых класах.*

- Фарміраванне першапачатковых ведаў па марфалогіі: часціны мовы, іх змяненне.
- Знаёмства з функцыянальнымі магчымасцямі вывучаемых часцін мовы.
- Засваенне форм словазмянення вывучаемых часцін мовы.
- Выпрацоўка першапачатковых навыкаў правапісу прыназоўнікаў, канчаткаў назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў.
- Развіццё граматычнага ладу маўлення навучэнцаў.

Пры вывучэнні тэмы «Часціны мовы» ў пачатковых класах навучэнцы набываюць першапачатковыя веды па марфалогіі і правапісе часцін мовы, у вучняў фарміруюцца марфалагічныя і арфаграфічныя ўменні.

**4.** Пры вывучэнні марфалогіі выкарыстоўваюцца наступныя метады працы: паведамленне настаўніка, эўрыстычная гутарка, моўны аналіз (марфалагічны аналіз назоўніка, прыметніка, дзеяслова, займенніка), моўнае канструяванне (утварэнне форм слоў; утварэнне словазлучэнняў і сказаў розных тыпаў з прапанаванымі назоўнікамі, прыметнікамі, займеннікамі, дзеясловамі, прыназоўнікамі), наглядныя метады, метад практыкаванняў.

Сярод марфалагічных практыкаванняў найбольш эфектыўнымі з’яўляюцца апазнаванне часціны мовы, вылучэнне яе граматычных прымет; падбор слоў пэўнай часціны мовы, утварэнне указаных форм слова, размежаванне амаформаў, групоўка слоў, складанне і запаўненне табліц.

Для размежавання часцін мовы, іх граматычных форм выкарыстоўваюцца прыёмы супастаўлення, падстаноўкі. Пры вывучэнні граматычных катэгорый розных часцін мовы прымяняюцца прыёмы аналізу, сінтэзу, класіфікацыі, абагульнення. Для выпрацоўкі ў вучняў уменняў ужываць назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы, займеннікі ў маўленні выкарыстоўваюцца прыёмы замены, трансфармацыі.

**Літаратура**


1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. План-канспект урокаў. 2 клас / В. І. Свірыдзенка. – Мінск: Аверсэв, 2022. – 272 с.
5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.
6. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.


## Лекцыйныя заняткі № 6. Методыка навучання арфаграфіі

**План лекцыі**

1. ***Задачы і змест навучання арфаграфіі.***
2. ***Прынцыпы навучання арфаграфіі.***
3. ***Арфаграфічны навык, умовы яго фарміравання.***
4. ***Развіццё арфаграфічнай зоркасці.***
5. ***Віды арфаграфічных практыкаванняў і методыка іх правядзення.***

**1.** Асноўнай мэтай навучання арфаграфіі ў пачатковых класах з’яўляецца фарміраванне ў навучэнцаў арфаграфічнай пісьменнасці.

Для дасягнення гэтай мэты важна вырашыць наступныя задачы:

- пазнаёміць вучняў з асноўнымі арфаграфічнымі паняццямі;
- сфарміраваць арфаграфічныя ўменні і навыкі;

- навучыць пісаць слоўнікавыя словы;
- сфарміраваць уменне карыстацца арфаграфічным слоўнікам.

Вучні пачатковых класаў засвойваюць напісанні, заснаваныя на розных прынцыпах беларускай арфаграфіі:

- ***фанетычным*** (правапіс **о, э – а**; **е, ё – я**; падоўжаных зычных; галосных пасля зацвярдзелых зычных; **ў**; **т – ц**; **д – дз**; прыставак на **з-, с-**; раздзяляльнага мяккага знака; апострафа);
- ***марфалагічным*** (правапіс парных звонкіх і глухіх зычных; прыставак на **б-**, **д-**);
- ***традыцыйным*** (правапіс вялікай літары; **У** (складовага) у пачатку ўласных назваў; **е** ў першым складзе перад націскам у словах неславянскага паходжання;
- ***лексіка-марфалагічным*** (правапіс прыназоўнікаў з назоўнікамі і займеннікамі; прыставак са словамі; **не** з дзеясловамі).
- ***семантычным, сінтаксічным і дыферэнцыйным*** (напісанне вялікай літары ў пачатку сказа,  у словах-амонімах).

**2.** Навучанне арфаграфіі павінна абапірацца на наступныя *прыватнаметадычныя прынцыпы*:

*агульныя*:

1) апора на сувязь вывучэння арфаграфіі з вывучэннем граматыкі і фанетыкі;
2) апора на апазнавальныя прыметы арфаграм;
3) прынцып уліку асаблівасцей рускай арфаграфіі пры навучанні беларускаму правапісу;

*прыватныя*:

1) прынцып супастаўлення гукаў слабай пазіцыі з гукамі моцнай пазіцыі ў пэўнай марфеме;
2) прынцып супастаўлення гука і яго фанетычнага акружэння;
3) прынцып супастаўлення ўласнага імя і ўласнага наймення і агульнага імя;
4) прынцып супастаўленне слова і структуры слова;
5) прынцып супастаўленне часціны мовы і члена сказа;
6) прынцып апоры на складовы састаў слова.

**3.** *Арфаграфічны навык* – гэта аўтаматызаваны кампанент свядомай маўленчай дзейнасці чалавека ва ўмовах працякання яе ў пісьмовай форме.

Арфаграфічны навык – складаны навык. Ён выпрацоўваецца ў працэсе працяглых практыкаванняў і заснаваны на больш простых навыках і ўменнях, такіх, як навык пісьма (аўтаматызаванае напісанне літар), уменне аналізаваць слова з фанетычнага боку (мэтанакіраваны гука-літарны і складовы аналіз), уменне ўстанаўліваць марфемны склад слова і знаходзіць у слове арфаграму,

якая патрабуе праверкі, уменне падвесці арфаграму пад адпаведнае ёй правіла і інш.

У фарміраванні арфаграфічнага навыку вылучаюць знаёмства з арфаграмай і яе апазнавальнымі прыметамі, разуменне сутнасці і запамінанне спосабу арфаграфічнага дзеяння, фарміраванне арфаграфічнага ўмення і яго аўтаматызацыю.

*Умовы фарміравання арфаграфічнага навыку:*

- перад тым, як пачаць выпрацоўваць пэўны арфаграфічны навык, важна дакладна вызначыць, якія веды і ўменні складаюць яго падмурак, якімі прыватнымі аперацыямі павінен авалодаць вучань, у якія ўзаемадзеянні павінны ўступіць гэтыя прыватныя аперацыі паміж сабой і чаму;
- вялікае значэнне для фарміравання арфаграфічнага навыку мае сістэма практыкаванняў;
- для фарміравання навыку важнай умовай з’яўляецца папярэджанне і выпраўленне арфаграфічных памылак.

**4.** *Арфаграфічная зоркасць* – гэта здольнасць хутка знаходзіць у прызначаным для запісу або напісаным тэксце арфаграмы і вызначаць іх тыпы Неразвітая арфаграфічная зоркасць – адна з прычын памылак у пісьмовых работах вучняў.

Пры сістэматычнай трэніроўцы зоркасць аўтаматызуецца і становіцца часткай арфаграфічнага навыку.

Арфаграфічная зоркасць развіваецца ў працэсе выканання розных практыкаванняў, накіраваных на зрокавае, слыхавое, артыкуляцыйнае, маторнае ўспрыманне і запамінанне арфаграфічнага матэрыялу.

**5.** Для выпрацоўкі арфаграфічнага навыку выкарыстоўваюцца практыкаванні, накіраваныя на: а) развіццё арфаграфічнай зоркасці; б) авалоданне аперацыямі, якія забяспечваюць прымяненне правіла; в) устанаўленне сувязі паміж прыватнымі аперацыямі; г) удакладненне для вучняў сутнасці і фармулёўкі правіла.

Да арфаграфічных практыкаванняў адносяцца: спісванне, дыктант, арфаграфічны разбор, свабоднае або самастойнае пісьмо (падбор уласных прыкладаў, пераказ і інш.), карэктура тэксту (выпраўленне памылак).

*Спісванне* – від арфаграфічных практыкаванняў, які прадугледжвае перадачу ў пісьмовай форме зрокава ўспрымаемага у момант запісу слова, сказа, тэксту.

Віды спісвання: з рукапіснага ці з друкаванага тэксту; ускладненае ці няўскладненае; навучальнае ці кантрольнае.

*Дыктант* – від арфаграфічных практыкаванняў, сутнасць якога для вучняў заключаецца ў запісе ўспрымаемага на слых сказа, слова, тэксту.

Віды дыктантаў: са зменай тэксту ці без змены тэксту; навучальны ці кантрольны (з граматычным заданнем ці без яго); папераджальны, тлумачальны,

каменціраваны, «Правяраю сябе», выбарачны, свабодны, творчы, пісьмо па памяці (самадыктант).

**Літаратура**

1. Антановіч, Н. М. Навучанне арфаграфіі ў пачатковых класах: вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. М. Антановіч. – Мінск : Нар. асвета, 2021. – 204 с.
2. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
3. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
4. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.

## Лекцыйныя заняткі № 7. Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах

**План лекцыі**

1. ***Значэнне вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.***
2. ***Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі.***
3. ***Задачы і змест вывучэння раздзела «Сказ» ў пачатковых класах.***
4. ***Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі.***

**1.** Асэнсаванне вучнямі заканамернасцяў злучэння слоў дапамагае зразумець сувязі, якія існуюць у структуры мовы. Авалоданне нормамі спалучальнасці лексем спрыяе ўзбагачэнню слоўніка вучняў, развіццю іх звязнага маўлення. Для забеспячэння маўленчага аспекту пры працы з усімі раздзеламі школьнага курса беларускай мовы яны вывучаюцца на сінтаксічнай аснове. Сказ выступае ў якасці асноўнай адзінкі маўлення, на аснове якой вучні пачатковых класаў усведамляюць ролю ў мове слоў розных часцін мовы. Вывучэнне элементаў пунктуацыі спрыяе навучанню дзяцей дакладнасці перадачы і правільнасці ўспрымання думкі, афармленай пісьмова.

**2.** Вывучэнне сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах павінна абапірацца на наступныя *прыватнаметадычныя прынцыпы*:

- інтанацыйны;

- марфолага-сінтаксічны;
- сэнсавы;
- навучання пунктуацыі ва ўзаемасувязі з сінтаксісам.

**3.** *Задачы вывучэння раздзела «Сказ» у пачатковых класах.*

- Фарміраванне першапачатковых ведаў пра сказ як асноўную сінтаксічную адзінку.
- Знаёмства з функцыянальнымі магчымасцямі сказаў розных тыпаў.
- Навучанне пабудове і афармленню на пісьме простых сказаў.
- Развіццё інтанацыйных навыкаў, граматычнага ладу маўлення навучэнцаў.
- Выпрацоўка пунктуацыйных навыкаў.

Пры вывучэнні раздзела «Сказ» у пачатковых класах навучэнцы набываюць першапачатковыя сінтаксічныя і пунктуацыйныя веды, у вучняў фарміруюцца сінтаксічныя і пунктуацыйныя ўменні.

**4.** Пры вывучэнні элементаў сінтаксіу і пуктуацыі ў пачатковых класах выкарыстоўваюцца эўрыстычная гутарка, моўны аналіз (сінтаксічны і пунктуацыйны аналіз сказа), моўнае канструяванне (утварэнне словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў розных тыпаў), камунікатыўныя метады, метад практыкаванняў.

Сярод сінтаксічных і пунктуацыйных практыкаванняў найбольш эфектыўнымі з’яўляюцца размежаванне сінтаксічных канструкцый розных відаў, вызначэнне структуры прапанаванай сінтаксічнай канструкцыі, складанне схем сказаў, складанне сказаў па схемах, складанне сказаў указанага тыпу і правільнае афармленне іх на пісьме, выразнае чытанне сказаў, тлумачэнне пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказе, ускладненае і няўскладненае спісванне, навучальныя дыктанты розных відаў.

У працэсе вывучэння элементаў сінтаксісу і пунктуацыі шырока выкарыстоўваюцца наступныя прыёмы: аналіз, сінтэз, параўнанне, замена, групоўка і абагульненне, алгарытмізацыя.

**Літаратура**

1. Методика обучения русскому языку и литературному чтению : учебник и практикум для вузов / Т. И. Зиновьева [и др.] ; под редакцией Т. И. Зиновьевой. – М. : Издательство Юрайт, 2023. – 468 с.
2. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. – 2-е изд., испр. – М.: Изд. центр «Академия» 2002. – 464 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2019. – 263 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. План-канспект урокаў. 2 клас / В. І. Свірыдзенка. – Мінск: Аверсэв, 2022. – 272 с.

5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.

6. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.

## Лекцыйныя заняткі КСР. Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры і нарматыўных дакументаў падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім асвятліць наступныя пытанні:

- значэнне беларускай мовы ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі;
- месца беларускай мовы ў тыпавых вучэбных планах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі;
- стратэгічная мэта моўнай адукацыі;
- крытэрыі, педагагічныя і лінгваметадычныя прынцыпы адбору зместу пачатковай моўнай адукацыі;
- пераемнасць і перспектыўнасць у выкладанні беларускай мовы;
- адукацыйны стандарт пачатковай адукацыі як аснова распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі, арганізацыі працэсу моўнай адукацыі і ажыццяўлення кантролю яе якасці.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры і нарматыўных дакументаў падрыхтаваць канспект лекцыі па адзначаных вышэй пытаннях.

Прааналізаваць стандарт пачатковай адукацыі і зрабіць канспект, у якім асвятліць наступныя пытанні:

- асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Беларуская мова»;
- асобасныя і метапрадметныя патрабаванні да вынікаў асваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі;
- прадметныя патрабаванні да вынікаў асваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова».

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры і нарматыўных дакументаў падрыхтаваць канспект лекцыі, зрабіць аналіз стандарту пачатковай адукацыі па адзначаных вышэй пытаннях. Параўнаць змест стандарту пачатковай адукацыі і вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»; адзначыць, якія раздзелы адукацыйнага стандарту знаходзяць адлюстраванне ў кожным раздзеле вучэбнай праграмы.

# ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## Практычныя заняткі № 1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука

**Мэта**: сфарміраваць уяўленні пра метадалагічныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы; пазнаёміць з асноўнымі паняццямі і катэгорыямі лінгваметодыкі, са структурай і метадамі лінгваметадычнага даследавання.

**Абсталяванне**: вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для 1–4 класаў, вучэбны дапаможнік «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах» (Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. Мінск : Выш. шк., 2019); электронны варыянт слоўніка «Новый словарь методических терминов и понятий (теория и практика обучения языкам)» (Э. Г. Азимов, А. Н. Щукин. М.: Издательство ИКАР, 2009).

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Вылучэнне сувязей методыкі выкладання беларускай мовы з філасофіяй, логікай, мовазнаўствам, псіхалогіяй, педагогікай.
2. Аналіз вучэбных праграм з мэтай вылучэння і характарыстыкі сучасных тэарэтычных падыходаў да выкладання мовы.
3. Складанне тэзаўрусу асноўных паняццяў і катэгорый лінваметодыкі.

**Дамашняе заданне**

Саставіць кластар асноўных паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі або падрыхтавацца да правядзення віктарыны.

## Практычныя заняткі № 2. Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання

**Мэта**: пазнаёміць з заканамернасцямі засваення беларускай мовы мовы, актуалізаваць веды пра агульнадыдактычныя прынцыпы і пазнаёміць з лінгвадыдактычнымі прынцыпамі навучання мове.

**Абсталяванне**: вучэбныя праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для 1–4 класаў, вучэбны дапаможнік «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах» (Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. Мінск : Выш. шк., 2019), вучэбны дапаможнік «Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка» (М. Г. Яленскі. Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005).

**Праверка дамашняга задання**

Прэзентацыя некалькімі студэнтамі складзеных кластараў.

Правядзенне віктарыны падрыхтаванымі студэнтамі

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Знаёмства з заканамернасцямі засваення мовы, вылучанымі Л. П. Федарэнка, А. І. Негнявіцкай, А. М. Шахнаровічам, М. Г. Яленскім і інш.

2. Прыгадванне і тлумачэнне сутнасці агульнадыдактычных прынцыпаў навучання беларускай мове. Ілюстрацыя іх рэалізацыі ў змесце вучэбных дапаможнікаў па беларускай мовае.

3. Знаёмства з лінгвадыдактычнымі прынцыпамі навучання мове. Ілюстрацыя іх рэалізацыі ў змесце вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове.

**Дамашняе заданне**

Саставіць кластар прынцыпаў навучання беларускай мове (як першай і як другой).

## Практычныя заняткі № 3. Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах

**Мэта**:актуалізаваць веды пра тыпалогію метадаў навучання, пазнаёміць з асноўнымі метадамі і прыёмамі навучання беларускай мове.

**Абсталяванне**: вучэбны дапаможнік «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах» (Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. Мінск : Выш. шк., 2019), вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання (аўтары Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава), вучэбны дапаможнік «Беларуская мова» для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

**Праверка дамашняга задання**

Прэзентацыя некалькімі студэнтамі складзеных кластараў.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Прыгадванне вядомых студэнтам класіфікацый метадаў навучання.

2. Устанаўленне суадносін паміж метадам і прыёмам навучання.

3. Знаёмства з метадамі навучання беларускай мове. Раскрыццё іх сутнасці з апорай на змест вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове.

4. Знаёмства з прыёмамі навучання беларускай мове. Ілюстрацыя іх прымянення пры вывучэнні раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе.

**Дамашняе заданне**

Прагляд відэазапісу фрагмента ўрока па адной з тэм раздзела «Гукі і літары» на адзіным інфармацыйна-адукацыйным рэсурсе *https://eior.by* (кожны студэнт атрымлівае індывідуальнае заданне). Аналіз метадаў і прыёмаў навучання, выкарыстаных настаўнікам.

## Практычныя заняткі № 4. Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі

**Мэта**: пазнаёміць з мэтай і зместам моўнай адукацыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Абсталяванне**: стандарт пачатковай моўнай адукацыі, розныя складнікі ВМК па беларускай мове для 2–4 класаў.

**Праверка дамашняга задання**

Праверка канспектаў з вынікамі аналізу прагледжаных відэазапісаў фрагментаў урока.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Стратэгічная мэта моўнай адукацыі.

2. Крытэрыі, педагагічныя і лінгваметадычныя прынцыпы адбору зместу пачатковай моўнай адукацыі.

3. Аналіз стандарту пачатковай моўнай адукацыі, вылучэнне прадметных вынікаў асваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»

4. Аналіз зместу вучэбных праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання: прынцыпы пабудовы, раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання

5. Знаёмства з асноўнымі і дадатковымі кампанентамі вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай мове для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

**Дамашняе заданне**

Пазнаёміцца з асноўнымі і дадатковымі кампанентамі вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай мове для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Запоўніць табліцу:

| ВМК па беларускай мове для 4 класа: | |
|---|---|
| *асноўныя складнікі* | *прызначэнне* |
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| *дадатковыя складнікі* | *прызначэнне* |
| 4. | |
| … | |
| … | |

## Практычныя заняткі № 5. Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання

**Мэта**: пазнаёміць з асаблівасцямі пабудовы курса беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання; са зместам працы ў вусным, уступным і сістэматычным курсах беларускай мовы.

**Абсталяванне**: розныя складнікі ВМК па беларускай мове для 1–2 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

**Праверка дамашняга задання**

Праверка запаўнення табліц.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз зместу вучэбных праграм па беларускай мове для 1–2 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання: раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання.

2. Аналіз вучэбнага дапаможніка па беларускай мове для 1 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання аўтараў Н. У. Антонавай, Г. А. Галяш: змест, тэматыка ўрокаў, асаблівасці арганізацыі працы ў вусным курсе.

3. Аналіз вучэбнага дапаможніка па беларускай мове для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання аўтара В. І. Свірыдзенка: змест уступнага курса, тэматыка ўрокаў у сістэматычным курсе, асаблівасці арганізацыі працы па папярэджанні інтэрферэнцыйных памылак навучэнцаў.

4. Распрацоўка фрагмента ўрока (тлумачэнне новага матэрыялу) ва ўступным курсе (праца ў групах).

**Дамашняе заданне**

1. Дапрацоўка канспектаў урокаў ва ўступным курсе.

2. Знаёмства з асноўнымі і дадатковымі кампанентамі вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай мове для 1 і 2 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Запаўненне табліц:

| **ВМК па беларускай мове для 1 класа:** | |
|---|---|
| ***асноўныя складнікі*** | ***прызначэнне*** |
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| ***дадатковыя складнікі*** | ***прызначэнне*** |
| 4. | |
| … | |
| … | |

| **ВМК па беларускай мове для 2 класа:** | |
|---|---|
| ***асноўныя складнікі*** | ***прызначэнне*** |
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| ***дадатковыя складнікі*** | ***прызначэнне*** |
| 4. | |
| … | |
| … | |

## Практычныя заняткі № 6. Урок беларускай мовы

**Мэта**: пазнаёміць з тыпамі ўрокаў беларускай мовы, іх структурнымі кампанентамі, асаблівасцямі пабудовы ўрока ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў, патрабаваннямі да ўрокаў; пазнаёміць з нагляднымі дапаможнікамі, тэхнічнымі і электроннымі сродкамі навучання беларускай мове.

**Абсталяванне**: вучэбны дапаможнік «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах» (Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. Мінск : Выш. шк., 2019); камп’ютары або смартфорны.

**Праверка дамашняга задання**

Праверка запаўнення табліц.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Знаёмства са структурнымі кампанентамі ўрокаў рознага тыпу. Складанне схемы «Тыпы і структура ўрокаў».
2. Знаёмства з патрабаваннямі да ўрока беларускай мовы.
3. Знаёмства з электроннымі сродкамі навучання беларускай мове, змешчанымі на адукацыйных рэсурсах *eior.by; http://e-vedy.adu.by*.
4. Прагляд відэафрагмента ўрока беларускай мовы, змешчанага на адукацыйным рэсурсе *eior.by*. Вылучэнне наглядных дапаможікаў, выкарыстаных настаўнікам на этапе тлумачэння новага матэрыялу.

**Дамашняе заданне**

Пазнаёміцца з дадатковымі матэрыяламі па беларускай мове, змешчанымі на адукацыйным рэсурсе *http://e-vedy.adu.by*. Распрацаваць этап урока замацавання новага матэрыялу па адной з тэм раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе з выкарыстаннем дыдактычных гульняў, змешчаных на адукацыйнага рэсурсе *http://e-vedy.adu.by*.

## Практычныя заняткі № 7. Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы

**Мэта:** пазнаёміць з асаблівасцямі арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці педагога і навучэнцаў ў працэсе навучання мове; фарміраваць уменне ацэньваць дзейнасць навучэнцаў на ўроках беларускай мовы.

**Абсталяванне**: Пастанова Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь «Об аттестации учащихся при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования» (зацверджана 11.07.22); метадычныя указанні па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прымяненні норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 15.09.22); вучэбныя выданні для дыягностыкі вучэбных дасягненняў навучэнцаў па беларускай мове.

**Праверка дамашняга задання**

Правядзенне распрацаваных фрагментаў урокаў з выкарыстаннем ЭСН некалькімі студэнтамі. Аналіз і абмеркаванне праведзеных фрагментаў урокаў.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз і абмеркаванне зместу нарматыўнага дакумента «Об аттестации учащихся при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования» (зацверджана 11.07.22).

2. Аналіз зместу наступных вучэбных выданняў:

- Зборнік дыктантаў па беларускай мове за перыяд навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Гоўзіч, Л. Ф. Кузняцова, І. І. Паўлоўскі, В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011. – 128 с.
- Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. Навучальныя пераказы : 2–4-я кл. : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. У. Антонава, В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Аверсэв, 2015. – 64 с.
- Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : 3-ці кл. : дыдакт. і дыягнаст. матэрыялы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Пачатк. шк., 2018. – 64 с.
- Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : 4-ы кл. : дыдакт. і дыягнаст. матэрыялы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. Г. Яленскі, В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Пачатк. шк., 2018. – 128 с.

**Дамашняе заданне**

Пазнаёміцца са зместам метадычных указанняў па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прымяненні норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбных прадметах (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 15.09.22); скласці апорны канспект па матэрыялах другой главы дакумента (с. 4–20).

## Практычныя заняткі № 8. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі

**Мэта:** пазнаёміць са зместам навучання фанетыцы і графіцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, з методыкай увядзення паняццяў гук, склад, націск, з асаблівасцямі фарміравання арфаграфічных навыкаў навучэнцаў пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі.

**Абсталяванне**: вучэбныя праграмы па беларускай мове (2 клас); вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання (аўтары Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава); вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

**Праверка дамашняга задання**

Узаемаправерка складзеных апорных канспектаў.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Параўнальна-супастаўляльны аналіз зместу раздзела «Гукі і літары» вучэбных праграм для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.

2. Параўнальна-супастаўляльны аналіз зместу раздзелаў «Гукі і літары» ў вучэбных дапаможніках па беларускай мове для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання (аўтары Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава) і з рускай мовай навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

3. Распрацоўка фрагмента ўрока па тэме «Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі о, э –а» (этап тлумачэння новага матэрыялу)

**Дамашняе заданне**

Дапрацаваць канспект урока па тэме «Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі о, э – а». Падрыхтавацца да яго правядзення.

## Практычныя заняткі № 9. Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі

**Мэта:** пазнаёміць са зместам навучання лексікалогіі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, з методыкай знаёмства са значэннем слова, сінонімамі, антонімамі, са спосабамі папярэджання інтэрферэнцыйных памылак навучэнцаў пры выкарыстанні міжмоўных амонімаў.

**Абсталяванне**: вучэбная праграма па беларускай мове (3 клас); вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

**Праверка дамашняга задання**

Правядзенне ўрока па тэме «Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі о, э – а» адным студэнтам. Аналіз і абмеркаванне праведзенага ўрока.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз зместу тэмы «Значэнне слова» вучэбнай праграмы для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

2. Аналіз зместу тэмы «Значэнне слова» ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і з рускай мовамі навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

3. Распрацоўка фрагмента першага ўрока па тэме «Значэнне слова» (этап тлумачэння новага матэрыялу).

4. Вылучэнне прыёмаў працы над прамым і пераносным значэннем слова, сінонімамі, антонімамі ў працэсе засваення правапісу слоўнікавых слоў (*воблака, шчасце, гасцінец*).

**Дамашняе заданне**

Распрацаваць фрагмент урока па тэме «Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні» (этап тлумачэння новага матэрыялу). Падрыхтавацца да яго правядзення.

## Практычныя заняткі № 10. Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння

**Мэта:** пазнаёміць са зместам вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, з методыкай знаёмства са значымымі часткамі слова; з асаблівасцямі фарміравання арфаграфічных навыкаў навучэнцаў пры вывучэнні марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння.

**Абсталяванне**: вучэбная праграма па беларускай мове (3 клас); вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

**Праверка дамашняга задання**

Правядзенне фрагментаў урока па тэме «Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні» некалькімі студэнтамі. Аналіз і абмеркаванне праведзеных фрагментаў урокаў.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз зместу тэмы «Склад слова» вучэбнай праграмы для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

2. Аналіз зместу тэмы «Склад слова» ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і з рускай мовамі навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

3. Распрацоўка фрагмента ўрока па тэме «Роднасныя (аднакаранёвыя словы. Корань слова» (этап тлумачэння новага матэрыялу).

4. Вылучэнне тыпаў арфаграм, якія засвойваюцца навучэнцамі 3 класа ў працэсе вывучэння тэмы «Склад слова».

**Дамашняе заданне**

Распрацаваць фрагмент урока па тэме «Прыстаўка» (этап тлумачэння новага матэрыялу). Падрыхтавацца да яго правядзення.

## Практычныя заняткі № 11. Методыка вывучэння марфалогіі

**Мэта:** пазнаёміць са зместам вывучэння марфалогіі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, з методыкай знаёмства з часцінамі мовы і іх катэгорыямі (род, лік назоўнікаў і прыметнікаў; час, лік дзеясловаў).

**Абсталяванне**: вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання (аўтары Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава); вучэбны дапаможнік па беларускай мове для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка); вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове для 3 і 4 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (аўтар В. І. Свірыдзенка).

**Праверка дамашняга задання**

Правядзенне фрагментаў урока па тэме «Прыстаўка» некалькімі студэнтамі. Аналіз і абмеркаванне праведзеных фрагментаў урокаў.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз зместу раздзела «Слова» ў вучэбных дапаможніках для 2 класа. Вылучэнне ўрока, прысвечанага першапачатковаму знаёмству з размежаваннем слоў на групы паводле лексіка-граматычных прымет. Вызначэнне адукацыйных мэт гэтага ўрока.
2. Аналіз зместу тэмы «Часціны мовы» ў вучэбных дапаможніках па беларускай мове для 3 і 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і з рускай мовамі навучання.
3. Распрацоўка фрагмента першага ўрока па тэме «Часціны мовы» ў 3 класе (этап тлумачэння новага матэрыялу).

**Дамашняе заданне**

Дапрацаваць канспект першага ўрока па тэме «Часціны мовы» ў 3 класе. Падрыхтавацца да яго правядзення.

## Практычныя заняткі № 12. Методыка навучання арфаграфіі

**Мэта:** пазнаёміць з метадамі і прыёмамі фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў, з асноўнымі прыёмамі працы з арфаграфічным правілам, відамі арфаграфічных практыкаванняў і методыкай іх правядзення.

**Абсталяванне**: вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове для 2–4 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі двух тыпаў.

**Праверка дамашняга задання**

Правядзенне ўрока па тэме «Часціны мовы» адным студэнтам. Аналіз праведзенага ўрока.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз зместу вучэбных праграм з мэтай вылучэння раздзелаў і тэм, у якіх прадугледжана засваенне арфаграм розных тыпаў. Вызначэнне прынцыпаў, па якіх матэрыял па арфаграфіі размяркоўваецца па розных раздзелах і тэмах вучэбных праграм.
2. Аналіз вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове з мэтай вылучэння метадаў і прыёмаў фарміравання арфаграфічных уменняў і навыкаў навучэнцаў, прыёмаў працы з арфаграфічным правілам.
3. Характарыстыка відаў арфаграфічных практыкаванняў і методыкі іх правядзення.
4. Распрацоўка плана ўрока правядзення кантрольнага дыктанта.

**Дамашняе заданне**

Падрыхтаваць сістэму працы па ўвядзенні на ўроку новага слоўнікавага слова, па замацаванні яго правапісу (кожны студэнт атрымлівае індывідуальнае заданне).

## Практычныя заняткі № 13. Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах

**Мэта:** пазнаёміць са зместам працы па вывучэнні сінтаксісу і пунктуацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, з методыкай знаёмства са сказамі розных тыпаў, са знакамі прыпынку ў іх.

**Абсталяванне**: вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі па беларускай мове для 2–4 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі двух тыпаў.

**Праверка дамашняга задання**

Дэманстрацыя некалькімі студэнтамі сістэмы працы па ўвядзенні на ўроку новага слоўнікавага слова, па замацаванні яго правапісу. Калектыўнае абмеркаванне прадстаўленых матэрыялаў.

**Пытанні для разгляду і абмеркавання, практычныя заданні**

1. Аналіз зместу вучэбных праграм з мэтай тлумачэння сутнасці лінейна-канцэнтрычнага прынцыпу падачы сінтаксічнага матэрыялу па гадах навучання, вылучэння тыпаў пунктаграм, якія засвойваюцца ў пачатковых класах.

2. Аналіз зместу раздзела «Сказ» у вучэбных дапаможніках па беларускай мове для 2–4 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі двух тыпаў.

3. Распрацоўка фрагмента першага ўрока па тэме «Аднародныя члены сказа» ў 4 класе (этап тлумачэння новага матэрыялу).

4. Складанне апорных схем для тлумачэння новага матэрыялу.

**Дамашняе заданне**

Дапрацаваць канспект першага ўрока па тэме «Аднародныя члены сказа». Падрыхтаваць неабходную нагляднасць.

## Практычныя заняткі КСР.
## Тэма: Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

Пазнаёміцца з «Другім чытаннем для дзяцей беларусаў» Я. Коласа, вызначыць тэматыку твораў, заканспектаваць 3 творы.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

Пазнаёміцца з «Методыкай роднай мовы» Я. Коласа, зрабіць канспект (асноўныя раздзелы, важныя палажэнні кожнага раздзела).

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

Пазнаёміцца з апошнімі навуковымі даследаваннямі ў галіне навучання малодшых школьнікаў беларускай мове і на гэтай аснове падрыхтаваць паведамленне па адным з актуальных пытанняў методыкі выкладання беларускай мовы.

## Тэма: Методыка вывучэння марфалогіі

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

Прааналізаваць праграмы па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, адзначыць у канспектах, як падаецца матэрыял па марфалогіі па гадах навучання (2–4 класы).

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

Прааналізаваць відэазапіс фрагмента ўрока па тэме «Часціны мовы», змешчанага на https://eior.by/ (тэма ўрока вызначаецца індывідуальна для кожнага студэнта). Падрыхтаваць уласныя нагляднасць, займальны дыдактычны матэрыял да прааналізаванага ўрока.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

Падрыхтаваць канспекты ўрокаў і паведамленні па групах.

*1 група:* Як пазнаёміць навучэнцаў 3 класа з родам назоўнікаў, навучэнцаў 4 класа – са скланеннем? Распрацаваць фрагменты ўрокаў па гэтых тэмах, падрыхтавацца да іх правядзення на занятках.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Назоўнік», апублікаваных у часопісах «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

*2 група:* Як арганізаваць вывучэнне тэмы «Змяненне прыметнікаў па родах» у 3 класе? Як пазнаёміць навучэнцаў 4 класа са скланеннем прыметнікаў? Распрацаваць фрагменты ўрокаў па гэтых тэмах, падрыхтавацца да іх правядзення на занятках.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Прыметнік», апублікаваных у часопісах «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

*3 група:* Як арганізаваць знаёмства з часам дзеясловаў у 3 класе? Як пазнаёміць навучэнцаў з сутнасцю спражэння дзеяслова? Якую часціну мовы мэтазгодна папярэдне паўтарыць? Чаму? Распрацаваць фрагменты урокаў па тэмах «Час дзеясловаў», «Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне)», падрыхтавацца да іх правядзення на занятках.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Дзеяслоў», апублікаваных у часопісах «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

## Тэма: Методыка навучання арфаграфіі

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вызначыць змест працы па арфаграфіі ў 2–4 класах.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вызначыць змест працы па арфаграфіі ў 2–4 класах.

Законспектаваць пералік слоўнікавых слоў, якія засвойваюцца вучнямі ў 2–4 класах (з указаннем класа і ўстановы адукацыі), размеркаваўшы іх па наступных групах:

- словы з неправяраемымі арфаграмамі;
- словы з цяжка правяраемымі арфаграмамі;
- словы з арфаграмамі, якія не вывучаюцца ў пачатковых класах.

Распрацаваць сваю сістэму заданняў і падрыхтаваць нагляднасць для засваення правапісу аднаго са слоўнікавых слоў (слоўнікавае слова вызначаецца індывідуальна для кожнага студэнта).

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вызначыць змест працы па арфаграфіі ў 2–4 класах. Распрацаваць сваю сістэму практыкаванняў для засваення адной з арфаграм, якія засвойваюцца навучэнцамі пачатковых класаў. Распрацаваць алгарытм выбару правільнага напісання і зрабіць адпаведную нагляднасць для прад'яўлення гэтага алгарытму навучэнцам на ўроку.

## Лабараторныя заняткі № 1. Урок беларускай мовы

**Мэта**: вучыць аналізаваць урокі беларускай мовы розных тыпаў; захоўваць сучасныя патрабаванні да ўрокаў пры распрацоўцы іх планаў-канспектаў.

**Абсталяванне**: відэазапіс узорнага ўрока; вучэбны дапаможнік «Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах» (Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. Мінск : Выш. шк., 2019).

**Пытанні для абмеркавання, практычныя заданні**

1. Прагляд відэаўрока беларускай мовы ў 3 класе па тэме «План тэксту».
2. Аналіз урока, запаўненне табліцы:

| Крытэрыі | Паказчыкі |
|---|---|
| Мэтамеркаванне | |
| Рэалізацыя прадметнага зместу | |
| Валоданне метадамі выкладання вучэбнага прадмета | |
| Арганізацыя дзейнасці навучэнцаў | |
| Кантрольна-ацэначная і рэфлексіўная дзейнасць | |
| Прафесійныя і асобасныя якасці педагога | |

3. Распрацоўка па групах плана-канспекта урока замацавання вывучага па тэме «План тэксту» (3 клас).
4. Узаемаабмен канспектамі, аналіз іх.

## Лабараторныя заняткі № 2. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі

**Мэта**: вучыць распрацоўваць урокі па раздзеле «Гукі і літары» ў 2 класе, падбіраць дыдактычны матэрыял для вывучэння фанетычных тэм, выкарыстоўваць розныя прыёмы выпрацоўкі ў вучняў фанетычных і графічных уменняў.

**Абсталяванне**: відэазапіс узорнага ўрока; вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання; вучэбныя выданні: Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : 2-гі кл. : рабочы сш. (Мінск, Аверсэв, 2018), Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. План-канспект урокаў. 2 клас ( Мінск: Аверсэв, 2022).

**Пытанні для абмеркавання, практычныя заданні**

1. Прагляд відэаўрока беларускай мовы ў 2 класе па тэме «Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме».

2. Аналіз урока (вызначэнне этапаў урока, метадаў і прыёмаў замацавання правапісу слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі; характарыстыка відаў заданняў, якія былі выкарыстаны настаўнікам на кожным этапе ўрока, дыдактычнага матэрыялу да ўрока).

3. Распрацоўка па групах планаў-канспектаў урокаў беларускай мовы ў 2 класе па тэмах «Цвёрдыя і мяккія і зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме», «Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі», «Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме».

4. Прадстаўленне кожнай групай студэнтаў распрацаваных планаў-канспектаў урокаў, абмеркаванне іх.

## Лабараторныя заняткі № 3. Методыка вывучэння марфалогіі

**Мэта**: вучыць распрацоўваць урокі па тэме «Часціны мовы» ў 4 класе, падбіраць дыдактычны матэрыял для вывучэння марфалагічных тэм, выкарыстоўваць розныя прыёмы фарміравання ў вучняў марфалагічных ведаў, выпрацоўкі марфалагічных уменняў.

**Абсталяванне**: відэазапіс фрагмента ўрока; вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання; вучэбныя выданні: Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : 4-ы кл. : рабочы сш. (Мінск, Аверсэв, 2018), Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020).

**Пытанні для абмеркавання, практычныя заданні**

1. Прагляд відэафрагмента ўрока беларускай мовы ў 4 класе па тэме «Займеннік як часціна мовы» на сайце *eior.by.*

2. Аналіз фрагмента ўрока (вызначэнне метадаў і прыёмаў фарміравання ў вучняў марфалагічных ведаў, выпрацоўкі марфалагічных уменняў; характарыстыка дыдактычнага матэрыялу да ўрока).

3. Распрацоўка па групах планаў-канспектаў урокаў беларускай мовы ў 4 класе па тэмах «Скланенне займенікаў 1-й асобы», «Скланенне займенікаў 2-й асобы», «Скланенне займенікаў 3-й асобы».

4. Прадстаўленне кожнай групай студэнтаў распрацаваных планаў-канспектаў урокаў, абмеркаванне іх.

## РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

### Прыкладны пералік пытанняў да экзамену

1. Сувязь методыкі выкладання беларускай мовы з філасофіяй, логікай, мовазнаўствам, псіхалогіяй, педагогікай.
2. Сучасныя тэарэтычныя падыходы ў методыцы выкладання беларускай мовы.
3. Сістэма паняццяў і катэгорый методыкі выкладання беларускай мовы.
4. Гістарычныя этапы развіцця методыкі выкладання беларускай мовы.
5. Роля Якуба Коласа ў станаўленні методыкі выкладання беларускай мовы.
6. Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове.
7. Класіфікацыі метадаў навучання беларускай мове. Характарыстыка асноўных метадаў навучання беларускай мове.
8. Характарыстыка асноўных прыёмаў навучання беларускай мове.
9. Значэнне беларускай мовы ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Месца вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў тыпавых вучэбных планах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.
10. Прынцыпы пабудовы праграмы па беларускай мове, асноўныя раздзелы, іх структура і ўзаемасувязь.
11. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай мове. Характарыстыка яго асноўных і дадатковых кампанентаў.
12. Асаблівасці вывучэння беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.
13. Стратэгіі авалодання беларускай мовай як другой і камунікатыўныя стратэгіі, якія засвойваюцца навучэнцамі пачатковых класаў.
14. Характарыстыка асноўных форм навучання беларускай мове.
15. Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх структурныя кампаненты.
16. Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.
17. Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання беларускай мове.
18. Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. Структура, змест, асаблівасці арганізацыі ўрокаў падагульнення вывучанага матэрыялу.
19. Віды кантролю на ўроках беларускай мовы.
20. Формы кантролю на ўроках беларускай мовы.
21. Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы.
22. Асаблівасці арганізацыі безадзнакавага навучання на ўроках беларускай мовы ў 1–2 класах.
23. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы ў 3–4 класах.

24. іВіды кантрольных пісьмовых работ па беларускай мове. Нормы ацэнкі гэтых відаў работ.

25. Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных пісьмовых работ (класных і дамашніх) на ўроках беларускай мовы.

26. Адукацыйнае і практычнае значэнне, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі ў пачатковых класах.

27. Задачы і змест, метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі ў пачатковых класах.

28. Методыка працы над гукамі, літарамі, складам, націскам пры вывучэнні раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе.

29. Развіццё мыслення і маўлення навучэнцаў пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі.

30. Прычыны ўзнікнення, прыёмы папярэджання і выпраўлення арфаэпічных і акцэнталагічных памылак у маўленні навучэнцаў.

31. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.

32. Задачы і змест, метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.

33. Методыка знаёмства з адназначнымі і мнагазначнымі словамі, з прамым і пераносным значэннем слова, з сінонімамі, антонімамі ў пачатковых класах.

34. Узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу, развіццё лагічнага мыслення навучэнцаў пры вывучэнні элементаў лексікалогіі.

35. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.

36. Задачы і змест, сістэма вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.

37. Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.

38. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах.

39. Задачы і змест вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах.

40. Сістэма вывучэння назоўніка ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў з родам, лікам, склонам назоўнікаў.

41. Сістэма вывучэння прыметніка ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў са змяненнем прыметнікаў па родах, ліках, склонах.

42. Сістэма вывучэння дзеяслова ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў з формамі часу дзеяслова, са змяненнем дзеясловаў па асобах і ліках.

43. Асаблівасці вывучэння займенніка ў пачатковых класах. Фарміраванне культуры маўлення навучэнцаў пры знаёмстве з асабовымі займеннікамі.

44. Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах.

45. Мэты, задачы, змест, прынцыпы навучання арфаграфіі ў пачатковых класах.

46. Сутнасць арфаграфічнага навыку, умовы яго выпрацоўкі. Сутнасць і структура арфаграфічнага дзеяння.

47. Выпрацоўка ўмення вызначаць арфаграфічную задачу. Паслядоўнасць вырашэння арфаграфічнай задачы.

48. Методыка працы над арфаграфічным правілам. Фарміраванне ў вучняў умення прымяняць арфаграфічныя правілы на пісьме.

49. Прыёмы выпрацоўкі арфаграфічных уменняў і навыкаў.

50. Прыёмы і формы развіцця арфаграфічнай зоркасці.

51. Віды арфаграфічных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

52. Алгарытмізацыя ў навучанні арфаграфіі. Алгарытм спісвання, Алгарытм пісьма пад дыктоўку.

53. Методыка вывучэння слоў з цяжкімі арфаграмамі (слоўнікавых слоў).

54. Прычыны арфаграфічных памылак. Папярэджанне арфаграфічных памылак у пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў.

55. Арганізацыя працы над арфаграфічнымі памылкамі. Структура ўрока працы над памылкамі.

56. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.

57. Задачы і змест, сістэма вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.

58. Методыка фарміравання асноўных сінтаксічных паняццяў у навучэнцаў пачатковых класаў.

59. Методыка працы над пунктаграмамі. Умовы эфектыўнага засваення сінтаксічных і пунктуацыйных паняццяў навучэнцамі пачатковых класаў.

60. Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі.

# ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ
## Вучэбная праграма

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
___________________ А.І.Жук
«_11_»___________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-27.3-л7-2024/вуч.

**МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ**

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя

2024 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0112-02-2023, зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0112-02 Пачатковая адукацыя, зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 042-2023/у, прыкладнай вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне, зацверджанай 12.10.2023, рэг. № 6-05-01-003/пр.

**СКЛАДАЛЬНІК:**
В.І. Свірыдзенка, дацэнт кафедры беларускага і рускага моваазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
А.В. Вернікоўская, дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
В.І. Цірынава, дактарант дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА**
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Пачатковая школа № 103 г. Мінска»

_______ М.А.Макарэвіч
«16» 10 _______ 2024 г.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускага і рускага моваазнаўства
пратакол № 3 ад «19» верасня 2024 г.

Загадчык кафедры
_______ Н.М.Антановіч

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
пратакол № 1 ад «15» 10. 2024 г.

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзейным патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела _______ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі _______ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай мовы» для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0112-02 «Пачатковая адукацыя».

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны вызначаецца тым, што моўнай адукацыі належыць важнае месца ў гуманітарным развіцці асобы, якое з'яўляецца прыярытэтнай задачай сучаснай школы. Навучанне беларускай мове ў Рэспубліцы Беларусь характарызуецца камунікатыўнай накіраванасцю, якая забяспечвае развіццё ў навучэнцаў гатоўнасці да эфектыўных маўленчых зносін у розных сферах дзейнасці. Менавіта таму пры падрыхтоўцы будучага настаўніка пачатковых класаў важна ўзброіць яго ведамі і ўменнямі, неабходнымі для фарміравання ў навучэнцаў базавых моўных ведаў, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да беларускай мовы, маўленча-камунікатыўных і агульнавучэбных уменняў і навыкаў, пазнаваўчага інтарэсу, маральна-этычных якасцей, звязаных з захаваннем правіл і прынцыпаў зносін.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны** – садзейнічаць набыццю студэнтамі тэарэтычных ведаў і практычных уменняў арганізацыі працэсу моўнай адукацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, кіравання пазнавальнай і камунікатыўнай дзейнасцю навучэнцаў на ўроках беларускай мовы.

**Задачы дысцыпліны:**

дапамагчы студэнтам засвоіць навукова-метадычныя веды аб накіраванасці, логіцы, структуры і змесце курса беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

сфарміраваць у студэнтаў прафесійна-метадычныя ўменні ў арганізацыі працэсу моўнай адукацыі: дапамагчы будучым настаўнікам усвядоміць мэту моўнай адукацыі; пазнаёміць з вучэбнымі праграмамі, вучэбнымі дапаможнікамі па беларускай мове; навучыць планаваць і арганізоўваць адукацыйны працэс, праводзіць розныя віды навучальных і кантрольных прац, весці апытанне; аб'ектыўна ацэньваць веды, уменні і навыкі навучэнцаў; правільна выкарыстоўваць нагляднасць і ТСН на ўроках беларускай мовы;

сфарміраваць прафесійныя ўменні настаўніка, здольнага забяспечыць навучэнцу паўнацэнную моўную адукацыю і маўленчае развіццё;

выхоўваць маральныя і прафесійна-значымыя якасці будучых педагогаў; стымуляваць творчыя пошукі студэнтаў, развіваць іх навукова-даследчыя здольнасці; удасканальваць навыкі самастойнай работы з навукова-метадычнай літаратурай.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста адпаведнага профілю, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі**

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай мовы» з’яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампанента, уваходзіць у модуль «Методыка філалагічнай адукацыі малодшых школьнікаў» і звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Беларуская мова», «Методыка развіцця маўлення», «Методыка выкладання рускай мовы», «Методыка выкладання літаратурнага чытання», «Методыка навучання грамаце і каліграфія».

**Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам**

Згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі і вучэбным планам па спецыяльнасці 6-05-0112-02 «Пачатковая адукацыя» вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў **універсальнай кампетэнцыі** УК-6: праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да змен у прафесійнай дзейнасці; **базавых прафесійных кампетэнцый** (БПК-1, 5): праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці; ажыццяўляць адбор зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

навукова-метадычныя асновы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах;

змест і патрабаванні праграмы па беларускай мове для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання;

метады і прыёмы навучання мове;

асаблівасці прымянення электронных сродкаў у працэсе моўнай адукацыі;

методыку вывучэння кожнага з раздзелаў курса беларускай мовы ў пачатковых класах;

**умець**:

планаваць вучэбную работу на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах;

рэалізоўваць пазнавальныя, развіццёвыя і выхаваўчыя задачы на ўроках беларускай мовы;

праводзіць аналіз дыдактычнага моўнага матэрыялу і выкарыстоўваць яго ў розных відах вучэбнай дзейнасці;

спалучаць работу па засваенні вучнямі норм і законаў беларускай мовы з фарміраваннем лінгвакультуралагічных уяўленняў і ведаў, камунікатыўных уменняў і навыкаў, належных маўленчых паводзін;

прымяняць разнастайныя метады і прыёмы навучання мове;

выкарыстоўваць электронныя сродкі навучання ў працэсе моўнай адукацыі;

выяўляць, класіфікаваць і папярэджваць моўныя і маўленчыя памылкі рознага характару ў вусных выказваннях і пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў;

**валодаць**:

навыкамі падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў беларускай мовы розных тыпаў;

метадамі і прыёмамі арганізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў;

інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі, якія забяспечваюць сучасны ўзровень моўнай адукацыі;

навыкамі ажыццяўлення кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання беларуска мове.

У межах адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны, выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам**

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай мовы» адведзена ўсяго 108 гадзін, з іх 54 аўдыторныя:

**для дзённай формы атрымання адукацыі:**

у 5 семестры 16 гадзін – лекцыі, з іх 2 гадзіны КСР, 32 гадзіны – практычныя заняткі, з іх 6 гадзін КСР, 6 гадзін – лабараторныя заняткі, 54 гадзіны – самастойная работа; форма кантролю – экзамен у 5 семестры;

**для завочнай формы атрымання адукацыі:**

у 5 семестры 4 гадзіны – лекцыі, 8 гадзін – практычныя заняткі, 2 гадзіны – лабараторныя заняткі; форма кантролю – экзамен у 6 семестры;

**для завочнай скарочанай формы атрымання адукацыі:**

у 3 семестры 4 гадзіны – лекцыі, 4 гадзіны – практычныя заняткі, 2 гадзіны – лабараторныя заняткі; форма кантролю – экзамен у 4 семестры.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складаюць 3 заліковыя адзінкі.

# РАЗМЕРКАВАННЕ БЮДЖЭТУ ВУЧЭБНАГА ЧАСУ
## для завочнай формы атрымання адукацыі
(5 гадоў навучання / 3,5 гады навучання)

| Назва вучэбнай дысцыпліны | Семестр | Колькасць гадзін вучэбных заняткаў | | | | | Самастойная (пазааўдыторная работа) | Форма прамежкавай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | аўдыторных | З іх | | | | |
| | | | | лекцыі | практычныя | лабараторныя | | |
| Методыка выкладання беларускай мовы | 5/3 | 108 | 14/10 | 4/4 | 8/4 | 2/2 | 94/98 | |
| | 6/4 | | | | | | | экзамен |
| Усяго гадзін | | 108 | 14/10 | 4/4 | 8/4 | 2/2 | 94/98 | |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

### 1.1. Методыка выкладання беларускай мовы як навука

Метадалагічныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы: сувязь яе з філасофіяй, логікай, мовазнаўствам, псіхалогіяй, педагогікай; сучасныя тэарэтычныя падыходы (сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны, лінгвакультуралагічны, асобасна арыентаваны, кампетэнтнасны). Прадмет, задачы, структура курса методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах. Сістэма паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі. Структура і метады лінгваметадычнага даследавання.

### 1.2. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы

Гістарычныя этапы развіцця методыкі выкладання беларускай мовы: перыяд станаўлення (1920–1930-я гг.), перыяд развіцця сістэмы моўнай адукацыі і лінгваметодыкі (1940–1980-я гг.), навейшы перыяд развіцця моўнай адукацыі і лінгваметодыкі ў Рэспубліцы Беларусь (канец XX ст. – пачатак XXI ст.). Роля К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа) у станаўленні методыкі выкладання беларускай мовы. Актуальныя праблемы методыкі выкладання беларускай мовы на розных этапах. Найноўшыя навуковыя даследаванні ў галіне методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах.

### 1.3. Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання

Сутнасць паняцця «заканамернасць засваення мовы». Заканамернасці засваення беларускай мовы як першай (роднай). Адметныя заканамернасці засваення беларускай мовы як другой. Агульнадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове: навуковасці, сістэматычнасці і паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці, адзінства навучання, выхавання і развіцця, станоўчага эмацыянальнага фону, антрапалізацыі адукацыі і інш. Сутнасць паняцця «лінгвадыдактычны прынцып навучання». Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове: функцыянальна-камунікатыўнай накіраванасці навучання, уліку фактару бікультурнага развіцця дзіцяці, скіраванасці навучання на этнакультурнае асэнсаванне беларускай мовы, арыентацыі працэсу навучання на засваенне літаратурных норм, дыферэнцыяльна-сістэматычны прынцып засваення беларускай мовы як другой і інш.

### 1.4. Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах

Класіфікацыі метадаў навучання: паводле крыніцы перадачы і ўспрымання вучэбнай інфармацыі (славесныя, наглядныя, практычныя, сінтэтычнага характару і інш.), паводле логікі перадачы інфармацыі (індуктыўныя, дэдуктыўныя і інш.), паводле характару вучэбнай дзейнасці (рэпрадуктыўныя і праблемна-пошукавыя). Асноўныя метады навучання беларускай мове: моўны аналіз, моўны сінтэз (канструяванне), паведамленне настаўніка, гутарка, дыдактычная гульня, метад практыкаванняў, камунікатыўныя метады. Прыёмы навучання беларускай мове: супрацьпастаўленне, падстаноўка, замена, трансфармацыя, групоўка, алгарытмізацыя і інш.

## РАЗДЗЕЛ 2. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ВУЧЭБНЫ ПРАДМЕТ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

### 2.1. Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі

Значэнне беларускай мовы ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі, у фарміраванні інтэлектуальна развітай асобы. Месца беларускай мовы ў тыпавых вучэбных планах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Стратэгічная мэта моўнай адукацыі. Мэта і задачы навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Крытэрыі, педагагічныя і лінгваметадычныя прынцыпы адбору зместу пачатковай моўнай адукацыі. Пераемнасць і перспектыўнасць у выкладанні беларускай мовы.

Адукацыйны стандарт пачатковай адукацыі як аснова распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі, арганізацыі працэсу моўнай адукацыі і ажыццяўлення кантролю яе якасці. Праграмы па беларускай мове для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі: прынцыпы пабудовы, раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне працэсу моўнай адукацыі ў пачатковых класах.

### 2.2. Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання

Спецыфіка пабудовы праграм па беларускай мове для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. Задачы вуснага курса, інтэграваны характар уступнага курса, маўленча-камунікатыўная і навучальна-моўная дзейнасць навучэнцаў пры вывучэнні раздзелаў «Гукі і літары», «Слова», «Сказ», «Тэкст». Стратэгіі авалодання другой мовай (імітацыя, звышгенералізацыя, перанос, аўтаматызацыя новых ведаў у практычнай

дзейнасці з акцэнтаваннем увагі на іх функцыянальнай значымасці і інш.) і камунікатыўныя стратэгіі (семантычнае і моўнае спрашчэнне, апора на вядомае, карэкціраванне выказвання і інш.), якія засвойваюцца навучэнцамі пачатковых класаў. Арганізацыя працы па папярэджанні інтэрферэнцыйных памылак.

### 2.3. Урок беларускай мовы

Індывідуальныя, групавыя, франтальныя, парныя, класныя і пазакласныя, школьныя і пазашкольныя формы навучання беларускай мове.

Урокі беларускай мовы, іх тыпы і структурныя кампаненты, асаблівасці пабудовы ў залежнасці ад зместу, тэмы, этапаў навучання, падрыхтоўкі вучняў. Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.

Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання, іх месца на ўроках беларускай мовы і прыёмы выкарыстання.

Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. Сістэматычнасць паўтарэння з мэтай замацавання вывучанага і паглыблення ведаў вучняў. Спецыяльныя ўрокі падагульнення вывучанага матэрыялу, іх структура, змест, асаблівасці арганізацыі.

### 2.4. Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы

Віды кантролю: па месцы ў працэсе навучання (папярэдні, паўрочны, тэматычны), па змесце (прагнастычны, пааперацыйны, кантроль па выніку), па суб’ектах кантрольна-ацэначнай дзейнасці (знешні кантроль аднакласнікамі (узаемакантроль і ўзаемаацэнка) або педагогам, рэфлексіўны (самакантроль і самаацэнка)). Дыягностыка моўнага і маўленчага развіцця навучэнцаў як прадмет кантрольна-ацэначнай дзейнасці на ўроках беларускай мовы. Формы кантролю на ўроках беларускай мовы: вусны (франтальнае, групавое, парнае, індывідуальнае апытанне), пісьмовы (самастойная работа, тэст, кантрольны дыктант, кантрольная работа).

Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы. Ацэнка славесная і бальная. Асаблівасці арганізацыі безадзнакавага навучання на ўроках беларускай мовы ў 1–2 класах. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы ў 3–4 класах.

Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных пісьмовых работ (класных і дамашніх), кантрольных пісьмовых работ (кантрольнае спісванне, кантрольны дыктант, кантрольны дыктант з граматычным заданнем, кантрольны слоўнікавы дыктант, кантрольная работа па тэме, тэматычны рознаўзроўневы тэст).

# РАЗДЗЕЛ 3. МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ АСОБНЫХ ТЭМ ШКОЛЬНАГА КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

## 3.1. Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі

Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі (апора на фанематычны слых вучняў, разгляд гука ў марфеме, супастаўленне гукаў і літар). Задачы і змест вывучэння раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе. Метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі. Методыка працы над гукамі, літарамі, складам, націскам. Развіццё ў навучэнцаў уменняў вызначаць гукавы і літарны склад слоў, распазнаваць галосныя і зычныя гукі, націскныя і ненаціскныя склады, парныя па цвёрдасці і мяккасці, звонкасці і глухасці зычныя гукі. Фарміраванне ў вучняў пачатковых класаў гукавога і графічнага вобразаў слоў, іх суаднясенне, высвятленне агульнага і адметнага. Знаёмства з алфавітам, фарміраванне ўмення карыстацца ім на практыцы.

Развіццё мыслення і маўлення дзяцей пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі. Развіццё ў вучняў фанематычных уменняў, выпрацоўка навыкаў літаратурнага вымаўлення. Арфаэпічныя і акцэнталагічныя памылкі, прычыны іх узнікнення, прыёмы і спосабы папярэджання і выпраўлення.

## 3.2. Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі

Значэнне вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі (сістэмны, кантэкстны, лексіка-граматычны, функцыянальна-семантычны, тэматычны). Задачы і змест вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах. Метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі. Методыка знаёмства з адназначнымі і мнагазначнымі словамі, з прамым і пераносным значэннем слова, з сінонімамі, антонімамі. Выпрацоўка ўменняў карыстання тлумачальным слоўнікам. Папярэджанне інтэрферэнцыйных памылак вучняў пры знаёмстве з міжмоўнымі амонімамі. Умовы паспяховага засваення лексічнага матэрыялу і фарміравання лексічных навыкаў.

Узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу, развіццё лагічнага мыслення навучэнцаў пры вывучэнні элементаў лексікалогіі.

## 3.3. Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння

Значэнне вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах. Значэнне словаўтваральнай працы ва ўзбагачэнні слоўнікавага запасу навучэнцаў. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу

слова (структурна-словаўтваральны, лексіка-словаўтваральны, матывацыйны). Задачы і змест вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.

Сістэма вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах: знаёмства вучняў з асаблівасцямі аднакаранёвых слоў і кораня слова, з роляй прыставак, суфіксаў, канчатка; вызначэнне асновы слова; паглыбленне ведаў пра марфемны склад слова і элементы словаўтварэння ў сувязі з вывучэннем часцін мовы.

Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова. Марфемны разбор як сродак асэнсаванага ўсведамлення марфемнай структуры слова.

Выпрацоўка арфаграфічнага навыку на аснове засваення марфемнай будовы слова. Віды практыкаванняў для вывучэння марфемнай будовы слова і выпрацоўкі арфаграфічных навыкаў.

### 3.4. Методыка вывучэння марфалогіі

Значэнне вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі (лексіка-граматычны, парадыгматычны, марфолага-сінтаксічны).

Задачы і змест працы па вывучэнні часцін мовы ў пачатковых класах.

Сістэма вывучэння назоўніка ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў з родам, лікам, склонам назоўнікаў. Знаёмства са скланеннем назоўнікаў. Засваенне склонавых пытанняў. Ужыванне прыназоўнікаў з назоўнікамі розных склонаў. Практычнае авалоданне формамі назоўнікаў першага, другога, трэцяга скланення. Развіццё маўлення і мыслення навучэнцаў пры вывучэнні назоўнікаў.

Сістэма вывучэння прыметніка ў 2–4 класах: фарміраванне паняцця «прыметнік», праца над катэгорыямі роду, ліку і склону прыметніка. Лексіка-стылістычная работа ў працэсе вывучэння прыметніка.

Сістэма вывучэння дзеяслова ў 2–4 класах: фарміраванне паняцця «дзеяслоў», азнаямленне вучняў з формамі часу дзеяслова, са змяненнем дзеясловаў па асобах і ліках; паняцце пра неазначальную форму дзеяслова, пра першае і другое спражэнні дзеясловаў. Развіццё маўлення вучняў у працэсе вывучэння дзеяслова.

Асаблівасці вывучэння займенніка ў пачатковых класах: практычнае выкарыстанне прыналежных і пытальных займеннікаў; знаёмства з асабовымі займеннікамі, асаблівасцямі іх змянення і ўжывання. Фарміраванне культуры маўлення навучэнцаў пры знаёмстве з асабовымі займеннікамі.

Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах. Работа над усведамленнем вучнямі ролі прыназоўнікаў, іх семантыкі. Навучанне выкарыстанню ў маўленні граматычных канструкцый з прыназоўнікамі і злучнікамі.

Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. Выпрацоўка арфаграфічнага навыку пры вывучэнні часцін мовы.

**3.5. Методыка навучання арфаграфіі**

Задачы, змест, прынцыпы навучання арфаграфіі. Сутнасць арфаграфічнага навыку, умовы яго выпрацоўкі. Сутнасць і структура арфаграфічнага дзеяння. Выпрацоўка ўмення вызначаць арфаграфічную задачу. Паслядоўнасць вырашэння арфаграфічнай задачы.

Методыка працы над арфаграфічным правілам. Фарміраванне ў вучняў умення прымяняць арфаграфічныя правілы на пісьме, улічваць тэарэтычныя звесткі, атрыманыя пры вывучэнні фанетыкі, марфемнай будовы слова, граматыкі.

Прыёмы выпрацоўкі правапісных уменняў і навыкаў з улікам прынцыпаў сучаснай беларускай арфаграфіі, характару напісанняў, этапаў навучання. Роля зрокавых, слыхавых, кінестэзічных аналізатараў у фарміраванні арфаграфічных дзеянняў. Алгарытмізацыя ў навучанні арфаграфіі. Прыёмы і формы развіцця арфаграфічнай пільнасці.

Арфаграфічныя практыкаванні (розныя віды спісвання і дыктантаў, граматыка-арфаграфічны разбор, лексіка-арфаграфічныя практыкаванні), методыка іх правядзення. Праца з арфаграфічным слоўнікам.

Методыка вывучэння слоў з цяжкімі арфаграмамі (слоўнікавых слоў).

Тыпалогія і прычыны арфаграфічных памылак. Папярэджанне арфаграфічных памылак у пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў. Арганізацыя працы над арфаграфічнымі памылкамі.

**3.6. Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах**

Значэнне вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах. Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі (інтанацыйны, марфолага-сінтаксічны, сэнсавы, прынцып навучання пунктуацыі ва ўзаемасувязі з сінтаксісам). Задачы і змест вывучэння раздзела «Сказ» у пачатковых класах. Лінейна-канцэнтрычны прынцып падачы сінтаксічнага і пунктуацыйнага матэрыялу ў 2–4 класах. Методыка фарміравання ў вучняў асноўных сінтаксічных паняццяў (сказ, тыпы сказаў, будова сказа, сувязь слоў у сказе, галоўныя і даданыя члены сказа, аднародныя члены сказа). Методыка працы над пунктаграмамі. Умовы эфектыўнага засваення сінтаксічных і пунктуацыйных паняццяў. Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі. Сінтаксічны разбор як сродак асэнсаванага ўсведамлення структуры сказа. Месца камунікатыўных практыкаванняў у сістэме выпрацоўкі сінтаксічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў навучэнцаў.

## ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

У сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў важнае месца займае навукова-даследчая работа студэнтаў, у прыватнасці такая яе форма арганізацыі, як напісанне і абарона курсавой работы (курсавога праекта).

Курсавая работа ўяўляе сабой лагічна завершаны і афармлены ў выглядзе тэксту твор навукова-даследчага зместу, накіраваны на вырашэнне пэўных праблем і задач у галіне методыкі выкладання беларускай мовы.

Выкананне курсавой работы накіравана на дасягненне наступных задач:

- сістэматызацыя, абагульненне, замацаванне і паглыбленне тэарэтычных і практычных ведаў па методыцы выкладання беларускай мовы;
- удасканаленне навыкаў прымянення атрыманых ведаў для рашэння канкрэтных задач, а таксама навыкаў самастойнай работы з навуковай літаратурай і апрацоўкі вынікаў тэарэтычных або эксперыментальных даследаванняў.

Тэма курсавой работы зацвярджаецца на кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі, а заданне на яе выкананне афармляецца кіраўніком.

| № п/п | Прыкладны аб'ём задання | Колькасць гадзін на выкананне |
|---|---|---|
| 1. | Вывучэнне навуковай і навукова-метадычнай літаратуры, інтэрнэт-рэсурсаў | 6 |
| 2. | Складанне плана курсавой работы і праграмы даследавання, вызначэнне навуковага апарату | 4 |
| 3. | Распрацоўка методыкі правядзення эксперымента | 4 |
| 4. | Напісанне ўводзінаў і першай главы курсавой работы | 6 |
| 5. | Арганізацыя і правядзенне эксперыментальнай работы | 4 |
| 6. | Напісанне другой главы курсавой работы | 6 |
| 7. | Апрацоўка і аналіз атрыманых вынікаў | 4 |
| 8. | Афармленне бібліяграфічнага спіса, дадаткаў | 4 |
| 9. | Падрыхтоўка да абароны | 1 |
| 10. | Абарона курсавой работы | 1 |
| Усяго | | 40 |

Патрабаванні да зместу, структуры, афармлення курсавой работы прадстаўлены ў Палажэнні аб парадку падрыхтоўкі і прадстаўлення да абароны курсавых работ у БДПУ.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
**«Методыка выкладання беларускай мовы»**
(дзённая форма атрымання адукацыі)

**3 курс, 5 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | КСР | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **1.** | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **2** | **6** | | | **2** | **16** | | |
| 1.1 | Методыка выкладання беларускай мовы як навука<br>1.1.1 Метадалагічныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы.<br>1.1.2 Прадмет, задачы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах.<br>1.1.3 Сістэма паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі.<br>1.1.4 Структура і метады лінгваметадычнага даследавання. | 2 | 2 | | | | 4 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |
| 1.2 | Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы | | | | | 2 | 4 | [1, 2] | Праверка канспектаў |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.3 | Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання<br>1.3.1 Заканамернасці засваення беларускай мовы як першай (роднай).<br>1.3.2 Адметныя заканамернасці засваення беларускай мовы як другой.<br>1.3.3 Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове. | | 2 | | | | 4 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |
| 1.4 | Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах<br>1.4.1 Класіфікацыі метадаў навучання беларускай мове.<br>1.4.2 Характарыстыка асноўных метадаў навучання беларускай мове.<br>1.4.3 Прыёмы навучання беларускай мове. | | 2 | | | | 4 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |
| **2.** | **Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах** | | **8** | **2** | **2** | | **14** | | |
| 2.1 | Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі<br>2.1.1 Задачы навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.<br>2.1.2 Праграмы па беларускай мове для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі: прынцыпы пабудовы, раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання.<br>2.1.3 Вучэбна-метадычнае забеспячэнне працэсу моўнай адукацыі ў пачатковых класах. | | 2 | | 2 | | 2 | [1, 2, 4] | Праверка канспектаў |
| 2.2 | Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі | | 2 | | | | 4 | [1, 2, 5, 8] | Франтальнае апытанне. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | з рускай мовай навучання і выхавання<br>2.2.1 Спецыфіка пабудовы праграм па беларускай мове для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання.<br>2.2.2 Задачы вуснага курса; інтэграваны характар уступнага курса беларускай мовы.<br>2.2.3 Арганізацыя працы па папярэджанні інтэрферэнцыйных памылак. | | | | | | | | **Рэйтынгавая кантрольная работа № 1** |
| 2.3 | Урок беларускай мовы<br>2.3.1 Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх структурныя кампаненты.<br>2.3.2 Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.<br>2.3.3 Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання на ўроках беларускай мовы.<br>2.3.4 Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. | | 2 | 2 | | | 4 | [1, 2] | Праверка рас-працаваных канспектаў урокаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» |
| 2.4 | Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы<br>2.4.1 Віды і формы кантролю на ўроках беларускай мовы.<br>2.4.2 Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы.<br>2.4.3 Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных і кантрольных пісьмовых работ па беларускай мове. | | 2 | | | | 4 | [1, 2, 4] | Франтальнае апытанне |
| **3** | **Методыка вывучэння асобных тэм школьнага курса беларускай мовы ў пачатковых класах** | **12** | **12** | **4** | | **4** | **24** | | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1 | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі<br>3.1.1 Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі.<br>3.1.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі.<br>3.1.3 Задачы і змест вывучэння раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе.<br>3.1.4 Метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі. | 2 | 2 | 2 | | | 4 | [1, 2, 3, 5] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў, дыдактычных гульняў па раздзеле «Гукі і літары» |
| 3.2 | Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі<br>3.2.1 Значэнне вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.<br>3.2.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі.<br>3.2.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах.<br>3.2.4 Метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі. | 2 | 2 | | | | 4 | [1, 2, 3, 6] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў, дыдактычных гульняў па тэме «Значэнне слова» |
| 3.3 | Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння<br>3.3.1 Значэнне вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.<br>3.3.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова.<br>3.3.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.<br>3.3.4 Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова. | 2 | 2 | | | | 4 | [1, 2, 6, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў, дыдактычных гульняў па тэме «Склад слова» |
| 3.4 | Методыка вывучэння марфалогіі | 2 | 2 | 2 | | 2 | 4 | [1, 2, 6, | Праверка рас- |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3.4.1 Значэнне вывучэння марфалогіі.<br>3.4.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі.<br>3.4.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Часціны мовы» ў пачатковых класах.<br>3.4.4 Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. | | | | | | | 7] | працаваных канспектаў урокаў, дыдактычных гульняў па тэме «Часціны мовы». **Рэйтынгавая кантрольная работа № 2** |
| 3.5 | Методыка навучання арфаграфіі<br>3.5.1 Задачы і змест навучання арфаграфіі.<br>3.5.2 Прынцыпы навучання арфаграфіі.<br>3.5.3 Арфаграфічны навык, умовы яго фарміравання.<br>3.5.4 Развіццё арфаграфічнай зоркасці.<br>3.5.5 Віды арфаграфічных практыкаванняў і методыка іх правядзення. | 2 | 2 | | | 2 | 4 | [1, 2, 3, 6, 7] | Праверка распрацаваных арфаграфічных практыкаванняў |
| 3.6 | Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах<br>3.6.1 Значэнне вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.<br>3.6.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі.<br>3.6.3 Задачы і змест вывучэння раздзела «Сказ» ў пачатковых класах.<br>3.6.4 Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі. | 2 | 2 | | | | 4 | [1, 2, 5, 6, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў, па раздзеле «Сказ» |
| | **Усяго за семестр** | **14** | **26** | **6** | **2** | **6** | **54** | | **экзамен** |

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«Методыка выкладання беларускай мовы»**
**(завочная форма атрымання адукацыі, 5 гадоў навучання)**

**3 курс, 5семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 8 | 9 | 10 |
| **1.** | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **2** | | | **24** | | |
| 1.1 | Методыка выкладання беларускай мовы як навука<br>1.1.1 Метадалагічныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы.<br>1.1.2. Прадмет, задачы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах.<br>1.1.3 Сістэма паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі. | 2 | | | 6 | [1, 2] | Пісьмовае апытанне |
| 1.2 | Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы | | | | 6 | [1, 2] | Праверка канспектаў |
| 1.3 | Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання<br>1.3.1 Заканамернасці засваення беларускай мовы як | | | | 6 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | першай (роднай).<br>1.3.2 Адметныя заканамернасці засваення беларускай мовы як другой.<br>1.3.3 Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове. | | | | | | |
| 1.4 | Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах<br>1.4.1 Класіфікацыі метадаў навучання беларускай мове.<br>1.4.2 Характарыстыка асноўных метадаў навучання беларускай мове.<br>1.4.3 Прыёмы навучання беларускай мове. | | | | 6 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |
| **2.** | **Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах** | | **2** | | **26** | | |
| 2.1 | Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі<br>2.1.1 Задачы навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.<br>2.1.2 Праграмы па беларускай мове для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі: прынцыпы пабудовы, раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання.<br>2.1.3 Вучэбна-метадычнае забеспячэнне працэсу моўнай адукацыі ў пачатковых класах. | | 2 | | 6 | [1, 2, 4] | Франтальнае апытанне |
| 2.2 | Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання<br>2.2.1 Спецыфіка пабудовы праграм па беларускай мове для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. | | | | 8 | [1, 2, 5, 8] | Франтальнае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2.2.2 Задачы вуснага курса; інтэграваны характар уступнага курса беларускай мовы.<br>2.2.3 Арганізацыя працы па папярэджанні інтэрферэнцыйных памылак. | | | | | | |
| 2.3 | Урок беларускай мовы<br>2.3.1 Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх структурныя кампаненты.<br>2.3.2 Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.<br>2.3.3 Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання на ўроках беларускай мовы.<br>2.3.4 Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. | | | | 6 | [1, 2] | Праверка рас-працаваных канспектаў урокаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» |
| 2.4 | Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы<br>2.4.1 Віды і формы кантролю на ўроках беларускай мовы.<br>2.4.2 Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы.<br>2.4.3 Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных і кантрольных пісьмовых работ па беларускай мове. | | | | 6 | [1, 2, 4] | Франтальнае апытанне |
| **3** | **Методыка вывучэння асобных тэм школьнага курса беларускай мовы ў пачатковых класах** | **2** | **6** | **2** | **44** | | |
| 3.1 | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі<br>3.1.1 Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі.<br>3.1.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі.<br>3.1.3 Задачы і змест вывучэння раздзела «Гукі і | | | 2 | 8 | [1, 2, 3, 5] | Абмеркаванне вынікаў аналізу відэаўрока па раздзеле «Гукі і літары» |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | літары» ў 2 класе.<br>3.1.4 Метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі. | | | | | | |
| 3.2 | Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі<br>3.2.1 Значэнне вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.<br>3.2.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі.<br>3.2.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах.<br>3.2.4 Метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі. | | | | 6 | [1, 2, 3, 6] | Праверка рас-працаваных канспектаў уро-каў, дыдактычных гульняў па тэме «Значэнне слова» |
| 3.3 | Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння<br>3.3.1 Значэнне вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.<br>3.3.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова.<br>3.3.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.<br>3.3.4 Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова. | | 2 | | 8 | [1, 2, 6, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў, дыдактычных гульняў па тэме «Склад слова» |
| 3.4 | Методыка вывучэння марфалогіі<br>3.4.1 Значэнне вывучэння марфалогіі.<br>3.4.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі.<br>3.4.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Часціны мовы» ў пачатковых класах.<br>3.4.4 Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. | 2 | | | 8 | [1, 2, 6, 7] | Пісьмовае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.5 | Методыка навучання арфаграфіі<br>3.5.1 Задачы і змест навучання арфаграфіі.<br>3.5.2 Арфаграфічны навык, умовы яго фарміравання.<br>3.5.3 Віды арфаграфічных практыкаванняў і методыка іх правядзення. | | 2 | | 8 | [1, 2, 3, 6, 7] | Праверка распрацаваных арфаграфічных практыкаванняў |
| 3.6 | Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах<br>3.6.1 Значэнне вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.<br>3.6.2 Задачы і змест вывучэння раздзела «Сказ» ў пачатковых класах.<br>3.6.3 Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі. | | 2 | | 6 | [1, 2, 5, 6, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па раздзеле «Сказ» |
| | **Усяго за семестр** | **4** | **8** | **2** | **94** | | |
| **3 курс, 6 семестр** | | | | | | | |
| | | | | | | | **экзамен** |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Методыка выкладання беларускай мовы»
## (завочная форма атрымання адукацыі, 3,5 гады навучання)

**2 курс, 3 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лабараторныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 8 | 9 | 10 |
| **1.** | **Агульныя пытанні методыкі выкладання беларускай мовы** | **2** | | | **24** | | |
| 1.1 | Методыка выкладання беларускай мовы як навука<br>1.1.1 Метадалагічныя асновы методыкі выкладання беларускай мовы.<br>1.1.2. Прадмет, задачы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах.<br>1.1.3 Сістэма паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі. | 2 | | | 6 | [1, 2] | Пісьмовае апытанне |
| 1.2 | Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы | | | | 6 | [1, 2] | Праверка канспектаў |
| 1.3 | Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання<br>1.3.1 Заканамернасці засваення беларускай мовы як | | | | 6 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | першай (роднай).<br>1.3.2 Адметныя заканамернасці засваення беларускай мовы як другой.<br>1.3.3 Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове. | | | | | | |
| 1.4 | Метады і прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах<br>1.4.1 Класіфікацыі метадаў навучання беларускай мове.<br>1.4.2 Характарыстыка асноўных метадаў навучання беларускай мове.<br>1.4.3 Прыёмы навучання беларускай мове. | | | | 6 | [1, 2] | Франтальнае апытанне |
| **2.** | **Беларуская мова як вучэбны прадмет у пачатковых класах** | | **2** | | **28** | | |
| 2.1 | Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі<br>2.1.1 Задачы навучання беларускай мове на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.<br>2.1.2 Праграмы па беларускай мове для І ступені агульнай сярэдняй адукацыі: прынцыпы пабудовы, раздзелы, змест, патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па гадах навучання.<br>2.1.3 Вучэбна-метадычнае забеспячэнне працэсу моўнай адукацыі ў пачатковых класах. | | 2 | | 6 | [1, 2, 4] | Франтальнае апытанне |
| 2.2 | Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання<br>2.2.1 Спецыфіка пабудовы праграм па беларускай мове для ўстаноў адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання. | | | | 8 | [1, 2, 5, 8] | Франтальнае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2.2.2. Задачы вуснага курса; інтэграваны характар уступнага курса беларускай мовы.<br>2.2.3 Арганізацыя працы па папярэджанні інтэрферэнцыйных памылак. | | | | | | |
| 2.3 | Урок беларускай мовы<br>2.3.1 Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх структурныя кампаненты.<br>2.3.2 Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.<br>2.3.3 Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання на ўроках беларускай мовы.<br>2.3.4 Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. | | | | 8 | [1, 2] | Праверка рас-працаваных канспектаў урокаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» |
| 2.4 | Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы<br>2.4.1 Віды і формы кантролю на ўроках беларускай мовы.<br>2.4.2 Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы.<br>2.4.3 Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных і кантрольных пісьмовых работ па беларускай мове. | | | | 6 | [1, 2, 4] | Франтальнае апытанне |
| **3** | **Методыка вывучэння асобных тэм школьнага курса беларускай мовы ў пачатковых класах** | **2** | **2** | **2** | **46** | | |
| 3.1 | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі<br>3.1.1 Адукацыйнае і практычнае значэнне вывучэння фанетыкі і графікі.<br>3.1.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі.<br>3.1.3 Задачы і змест вывучэння раздзела «Гукі і | | | 2 | 8 | [1, 2, 3, 5] | Абмеркаванне вынікаў аналізу відэаўрока па раздзеле «Гукі і літары» |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | літары» ў 2 класе.<br>3.1.4 Метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі. | | | | | | |
| 3.2 | Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі<br>3.2.1 Значэнне вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.<br>3.2.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі.<br>3.2.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Значэнне слова» ў пачатковых класах.<br>3.2.4 Метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі. | | | | 8 | [1, 2, 3, 6] | Праверка рас-працаваных канспектаў уро-каў, дыдактычных гульняў па тэме «Значэнне слова» |
| 3.3 | Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння<br>3.3.1 Значэнне вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.<br>3.3.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова.<br>3.3.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Склад слова» ў пачатковых класах.<br>3.3.4 Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова. | | | | 8 | [1, 2, 6, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў, дыдактычных гульняў па тэме «Склад слова» |
| 3.4 | Методыка вывучэння марфалогіі<br>3.4.1 Значэнне вывучэння марфалогіі.<br>3.4.2 Прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі.<br>3.4.3 Задачы і змест вывучэння тэмы «Часціны мовы» ў пачатковых класах.<br>3.4.4 Метады і прыёмы вывучэння марфалогіі. | 2 | | | 8 | [1, 2, 6, 7] | Пісьмовае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.5 | Методыка навучання арфаграфіі<br>3.5.1 Задачы і змест навучання арфаграфіі.<br>3.5.2 Арфаграфічны навык, умовы яго фарміравання.<br>3.5.3 Віды арфаграфічных практыкаванняў і методыка іх правядзення. | | 2 | | 8 | [1, 2, 3, 6, 7] | Праверка распрацаваных арфаграфічных практыкаванняў |
| 3.6 | Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах<br>3.6.1 Значэнне вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.<br>3.6.2 Задачы і змест вывучэння раздзела «Сказ» ў пачатковых класах.<br>3.6.3 Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі. | | | | 6 | [1, 2, 5, 6, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па раздзеле «Сказ» |
| | **Усяго за семестр** | **4** | **4** | **2** | **98** | | |
| **2 курс, 4 семестр** | | | | | | | |
| | | | | | | | **экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Методыка выкладання беларускай мовы [Электронны рэсурс] : электрон. вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» / склад. В. І. Свірыдзенка // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/60544. – Дата доступу: 04.10.2024.

2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – 2-е выд. – Мінск : Выш. шк., 2020. – 264 с.

**Дадатковая літаратура**

3. Антановіч, Н. М. Беларуская мова ў 2 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы агул. сярэд. адукацыі, з беларус. мовай навучання і выхавання / Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава. – Мінск : Акад. адукацыі, 2024. – 288 с.

4. Образовательный стандарт начального образования // Пачатк. навучанне: сям’я, дзіцячы сад, шк. – 2019. – № 2. – С. 3–15.

5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 2 кл. / В. І. Свірыдзенка, Н. У. Антонава. – Мінск : Аверсэв, 2023. – 272 с.

6. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.

7. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.

8. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка : манаграфія / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 280 с.

## Пералік заданняў кантрольных мерапрыемстваў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай мовы»

### Лекцыйныя заняткі:

Тэма: **Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі (2 г)**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры і нарматыўных дакументаў падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім асвятліць наступныя пытанні:

- значэнне беларускай мовы ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі;
- месца беларускай мовы ў тыпавых вучэбных планах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі;
- стратэгічная мэта моўнай адукацыі;
- крытэрыі, педагагічныя і лінгваметадычныя прынцыпы адбору зместу пачатковай моўнай адукацыі;
- пераемнасць і перспектыўнасць у выкладанні беларускай мовы;
- адукацыйны стандарт пачатковай адукацыі як аснова распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі, арганізацыі працэсу моўнай адукацыі і ажыццяўлення кантролю яе якасці.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры і нарматыўных дакументаў падрыхтаваць канспект лекцыі па адзначаных вышэй пытаннях.

Прааналізавць стандарт пачатковай адукацыі і зрабіць канспект, у якім асвятліць наступныя пытанні:

- асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Беларуская мова»;
- асобасныя і метапрадметныя патрабаванні да вынікаў асваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі;
- прадметныя патрабаванні да вынікаў асваення зместу адукацыйнай праграмы пачатковай адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова».

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры і нарматыўных дакументаў падрыхтаваць канспект лекцыі, зрабіць аналіз стандарту пачатковай адукацыі па адзначаных вышэй пытаннях. Параўнаць змест стандарту пачатковай адукацыі і вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»; адзначыць, якія разделы адукацыйнага стандарту знаходзяць адлюстраванне ў кожным раздзеле вучэбнай ппраграмы.

**Практычныя заняткі:**

Тэма: **Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы (2 г)**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

Пазнаёміцца з «Другім чытаннем для дзяцей беларусаў» Я. Коласа, вызначыць тэматыку твораў, заканспектаваць 3 творы.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

Пазнаёміцца з «Методыкай роднай мовы» Я. Коласа, зрабіць канспект (асноўныя раздзелы, важныя палажэнні кожнага раздзела).

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

Пазнаёміцца з апошнімі навуковымі даследаваннямі ў галіне навучання малодшых школьнікаў беларускай мове і на гэтай аснове падрыхтаваць паведамленне па адным з актуальных пытанняў методыкі выкладання беларускай мовы.

Тэма: **Методыка вывучэння марфалогіі (2 г)**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

Прааналізаваць праграмы па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання, адзначыць у канспектах, як падаецца матэрыял па марфалогіі па гадах навучання (2-4 класы).

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

Прааналізаваць відэазапіс фрагмента ўрока па тэме «Часціны мовы», змешчанага на https://eior.by/ (тэма ўрока вызначаецца індывідуальна для кожнага студэнта). Падрыхтаваць уласныя нагляднасць, займальны дыдактычны матэрыял да прааналізаванага ўрока.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

Падрыхтаваць канспекты ўрокаў і паведамленні па групах.

*1 група:* Як пазнаёміць навучэнцаў 3 класа з родам назоўнікаў, навучэнцаў 4 класа – са скланеннем? Распрацаваць фрагменты ўрокаў па гэтых тэмах, падрыхтавацца да іх правядзення на занятках.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Назоўнік», апублікаваных у часопісах «Пачатковае навучанне», «Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

*2 група:* Як арганізаваць вывучэнне тэмы «Змяненне прыметнікаў па родах» у 3 класе? Як пазнаёміць навучэнцаў 4 класа са скланеннем

прыметнікаў? Распрацаваць фрагменты ўрокаў па гэтых тэмах, падрыхтавацца да іх правядзення на занятках.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Прыметнік», апублікаваных у часопісах «Пачатковае навучанне», «Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

*3 група:* Як арганізаваць знаёмства з часам дзеясловаў у 3 класе? Як пазнаёміць навучэнцаў з сутнасцю спражэння дзеяслова? Якую часціну мовы мэтазгодна папярэдне паўтарыць? Чаму? Распрацаваць фрагменты урокаў па тэмах «Час дзеясловаў», «Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне)», падрыхтавацца да іх правядзення на занятках.

Скласці анатацыі артыкулаў па тэме «Дзеяслоў», апублікаваных у часопісах «Пачатковае навучанне», «Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў.

Тэма: **Методыка навучання арфаграфіі (2 г)**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вызначыць змест працы па арфаграфіі ў 2–4 класах.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вызначыць змест працы па арфаграфіі ў 2–4 класах.

Заканспектаваць пералік слоўнікавых слоў, якія засвойваюцца вучнямі ў 2–4 класах (з указаннем класа і ўстановы адукацыі), размеркаваўшы іх па наступных групах:

- словы з неправяраемымі арфаграмамі;
- словы з цяжка правяраемымі арфаграмамі;
- словы з арфаграмамі, якія не вывучаюцца ў пачатковых класах.

Распрацаваць сваю сістэму заданняў і падрыхтаваць нагляднасць для засваення правапісу аднаго са слоўнікавых слоў (слоўнікавае слова вызначаецца індывідуальна для кожнага студэнта).

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове аналізу праграм па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання вызначыць змест працы па арфаграфіі ў 2–4 класах. Распрацаваць сваю сістэму практыкаванняў для засваення адной з арфаграм, якія засвойваюцца навучэнцамі пачатковых класаў. Распрацаваць алгарытм выбару правільнага напісання і зрабіць адпаведную нагляднасць для прад’яўлення гэтага алгарытму навучэнцам на ўроку.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай (пазааўдыторнай) работы студэнта па вучэбнай дысцыпліне

Самастойная работа з’яўляецца спецыфічным педагагічным сродкам арганізацыі і кіравання самастойнай дзейнасцю студэнтаў у вучэбным працэсе. Самастойная работа студэнтаў фарміруе гатоўнасць да самаадукацыі, павышэння кваліфікацыі, рыхтуе базу для непарыўнай адукацыі.

Пры вывучэнні дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя метады арганізацыі самастойнай работы студэнтаў:

– напісанне і выступленне з дакладам (прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне па прад’яўленні атрыманых вынікаў рашэння вызначанай вучэбна-практычнай, вучэбна-даследчай ці навуковай тэмы);

– складанне гласарыя (слоўнік тэрмінаў на вызначаную тэму);

– складанне граф-схемы (графічнае адлюстраванне лагічных сувязей паміж асноўнымі суб’ектамі тэксту);

– стварэнне сводной (абагульняючай) табліцы (канцэнтрыраванае прадстаўленне адносін паміж з’явамі, працэсамі, якія вывучаюцца);

– распрацоўка планаў-канспектаў урокаў, фрагментаў урокаў (прадукт самастойнай работы студэнта, які прадугледжвае напісанне канспекта на вызначаную тэму ўрока з адлюстраваннем метадаў, прыёмаў, сродкаў навучання);

– падбор дыдактычных гульняў, дыдактычнага матэрыялу па прапанаваных тэмах (прадукт самастойнай работы студэнта, які прадугледжвае пошук і сістэматызацыю дыдактычнага матэрыялу, яго прад’яўленне);

– складанне бібліяграфічнага спіса артыкулаў на вызначаныя метадычныя тэмы;

– аналіз вучэбных праграм, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі і інш.

Кантроль самастойнай работы ажыццяўляецца ў выглядзе:

– кантрольнай работы;

– пісьмовай работы;

– тэсціравання (у тым ліку і ў сістэме Moodle);

– абмеркавання дакладаў;

– індывідуальных гутарак;

– выканання кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў і інш.

**Патрабаванні да выканання самастойнай (пазааўдыторнай) работы студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі**

| № п//п | Назва тэмы, раздела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 4 | На аснове аналізу метадычнай літаратуры складці тэзаурус асноўных паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі.<br>Складці схему «Метады педагагічнага даследавання». | гласарый<br><br>граф-схема |
| 2. | Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы | 4 | На аснове вывучэння метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім ахарактарызаваць гістарычныя этапы развіцця лінгваметодыкі.<br>На аснове аналізу тэматыкі дысертацыйных даследаванняў па методыцы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах (пачатак XXI ст.) вызначыць актуальныя праблемы беларускай лінгваметодыкі. | апорны канспект<br><br>выступленне з паведамленнем |
| 3. | Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання | 4 | Складці схему «Заканамернасці засваення беларускай мовы».<br>Складці схему «Прынцыпы навучання беларускай мове». | граф-схема<br><br>граф-схема |
| 4. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 4 | Складці схему «Метады навучання беларускай мове ў пачатковых класах».<br>Распрацаваць фрагмент урока з выкарыстаннем метаду моўнага канструявання. | граф-схема<br><br>фрагмент план-канспекта ўрока беларускай мовы |
| 5. | Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі | 2 | Прааналізаваць вучэбныя праграмы па беларускай мове для пачатковых класаў; вылучыць і заканспектаваць мэту і задачы пачатковай моўнай адукацыі. Ахарактарызаваць асноўныя кампаненты ВМК па беларускай мове. | апорны канспект |
| 6. | Асаблівасці пабудовы курса беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і | 4 | Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах».<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і | план-канспект ўрока беларускай мовы<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | выхавання | | беларускай мовах». | |
| 7. | Урок беларускай мовы | 4 | Скласці схему «Асноўныя тыпы урокаў беларускай мовы».<br>Прааналізаваць навукова-метадычныя часопісы «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» за апошнія два гады, законспектаваць узорныя аўтарскія ўрокі па беларускай мове, якія сустрэліся ў часопісах. | граф-схема<br>картатэка ўзорных план-канспектаў урокаў |
| 8. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы | 4 | Пазнаёміцца з нормамі ацэнкі вуснага адказу, навучальных пісьмовых работ (класных і дамашніх), кантрольных пісьмовых работ навучэнцаў пачатковых класаў; падрыхтаваць паведамленне з мультымедыйнай прэзентацыяй.<br>Праверыць і ацаніць пісьмовыя пераказы пяці навучэнцаў 3 або 4 класа; скласці табліцу аналізу памылак. | выступленне з паведамленнем<br>табліца аналізу памылак, дапушчаных вучнямі ў пісьмовым пераказе |
| 9. | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі | 4 | Прааналізаваць раздзел вучэбнай праграмы па беларускай мове «Гукі і літары», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры вывучэнні раздзела.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі о, э – а». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| 10. | Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі | 4 | Прааналізаваць тэму вучэбнай праграмы па беларускай мове «Значэнне слова», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры яе вывучэнні.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Сінонімы». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| 11. | Методыка вывучэння | 4 | Прааналізаваць тэму вучэбнай праграмы па | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння | | беларускай мове «Склад слова», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры яе вывучэнні.<br>Распрацаваць план-канспект урока беларускай мовы па тэме «Суфікс». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| 12. | Методыка вывучэння марфалогіі | 4 | Прааналізаваць тэму вучэбнай праграмы па беларускай мове «Часціны мовы», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры яе вывучэнні.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Займеннік як часціна мовы». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| 13. | Методыка навучання арфаграфіі | 4 | На аснове аналізу метадычнай літаратуры ахарактарызаваць розныя віды дыктантаў і скласці схему «Віды дыктантаў».<br>Распрацаваць план-канспект урока правядзення кантрольнага дыктанта ў 3 класе. | граф-схема<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| 14. | Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах | 4 | Прааналізаваць раздзел вучэбнай праграмы па беларускай мове «Сказ», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры вывучэнні раздзела.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Аднародныя члены сказа». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| Усяго | | 54 | | |

## Патрабаванні да выканання самастойнай (пазааўдыторнай) работы студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі

| № п//п | Назва тэмы, раздела | Колькасць гадзін на СРС | | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 5 г.н. | 3,5 г.н. | | |
| 1. | Методыка выкладання беларускай мовы як навука | 6 | 6 | На аснове вывучэння метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім асвятліць наступныя пытанні: сучасныя тэарэтычныя падыходы ў лінгвадыдактыцы; структура курса методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах; структура педагагічнага даследавання.<br>На аснове аналізу метадычнай літаратуры скласці тэзаурус асноўных паняццяў і катэгорый лінгваметодыкі.<br>Скласці схему «Метады педагагічнага даследавання» | апорны канспект<br>гласарый<br>граф-схема |
| 2. | Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай мовы | 6 | 6 | На аснове вывучэння метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім ахарактарызаваць гістарычныя этапы развіцця лінгваметодыкі.<br>На аснове аналізу тэматыкі дысертацыйных даследаванняў па методыцы выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах (пачатак XXI ст.) вызначыць актуальныя праблемы беларускай лінгваметодыкі.<br>На аснове аналізу навукова-метадычных артыкулаў «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям’я, зіцячы сад, школа» за апошнія 5 гадоў скласці бібліяграфічны спіс артыкулаў, прысвечаных актуальным пытанням лінгваметодыкі. | апорны канспект<br>выступленне з паведамленнем<br>бібліяграфічны спіс |
| 3. | Заканамернасці засваення мовы і прынцыпы навучання | 6 | 6 | Скласці схему «Заканамернасці засваення беларускай мовы».<br>Скласці схему «Прынцыпы | граф-схема |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | навучання беларускай мове». Ахарактарызаваць прынцыпы навучанння беларускай мове як другой. | граф-схема выступленне з паведамленнем |
| 4. | Метады і прыёмы навучання беларускай мове | 6 | 6 | Скласці схему «Метады навучання беларускай мове ў пачатковых класах»<br>Скласці схему «Прыёмы навучання беларускай мове ў пачатковых класах»<br>Распрацаваць фрагмент урока з выкарыстаннем метаду моўнага канструявання. | граф-схема<br>граф-схема<br>фрагмент план-канспекта ўрока беларускай мовы |
| 5. | Мэты і змест пачатковай моўнай адукацыі | 6 | 6 | Прааналізаваць вучэбныя праграмы па беларускай мове для пачатковых класаў; вылучыць і законспектаваць мэту і задачы пачатковай моўнай адукацыі.<br>Скласці схему «Прынцыпы адбору зместу навучання беларускай мове ў пачатковых класах».<br>Ахарактарызаваць асноўныя кампаненты ВМК па беларускай мове. | апорны канспект<br>граф-схема<br>выступленне з паведамленнем |
| 6. | Асаблівасці пабудовы курса беларускай мо-вы ва ўстановах агульнай сярэдняй аду-кацыі з рускай мовай навучання і выхавання | 8 | 8 | Ахарактарызаваць этапы навучання беларускай мове як другой у пачатковых класах.<br>Распрацаваць план-канспект урока ў вусным курсе беларускай мовы (1 клас)<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах».<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Назоўнікі, лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока бела-рускай мовы<br>план-канспект ўрока бела-рускай мовы<br>план-канспект ўрока бела-рускай мовы |
| 7. | Урок беларускай мовы | 6 | 8 | Скласці схему «Асноўныя тыпы урокаў беларускай мовы».<br>Запоўніць табліцу «Патрабаванні да ўрока беларускай мовы ў пачатковых класах».<br>Прааналізаваць навукова-метадычныя часопісы «Пачатковая школа», «Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа» за | граф-схема<br>апорная табліца<br>картатэка ўзорных план-канспектаў урокаў |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | апошнія два гады, законспектаваць узорныя аўтарскія ўрокі па беларускай мове, якія сустрэліся ў часопісах.<br>Скласці схему «Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання для ўрокаў беларускай мовы». | граф-схема |
| 8. | Кантрольна-ацэначная дзейнасць на ўроках беларускай мовы | 6 | 6 | Пазнаёміцца з нормамі ацэнкі вуснага адказу, навучальных пісьмовых работ (класных і дамашніх), кантрольных пісьмовых работ навучэнцаў пачатковых класаў; падрыхтаваць паведамленне з мультымедыйнай прэзентацыяй.<br>Праверыць і ацаніць пісьмовыя пераказы пяці навучэнцаў 3 або 4 класа; скласці табліцу аналізу памылак.<br>Праверыць і ацаніць кантрольныя дыктанты пяці навучэнцаў 3 або 4 класа; скласці табліцу аналізу памылак. | выступленне з паведамленнем<br>табліца аналізу памылак<br>табліца аналізу памылак |
| 9. | Методыка вывучэння асноў фанетыкі і графікі | 8 | 8 | Прааналізаваць раздзел вучэбнай праграмы па беларускай мове «Гукі і літары», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры вывучэнні раздзела.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Склад. Падзел слоў на склады».<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі о, э – а».<br>Скласці схему «Арфаэпічныя і акцэнталагічныя памылкі, прычыны іх узнікнення». | выступленне з паведамленнем<br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br>граф-схема |
| 10. | Методыка вывучэння элементаў лексікалогіі | 6 | 8 | Прааналізаваць тэму вучэбнай праграмы па беларускай мове «Значэнне слова», вызначыць патрабаванні да ведаў, | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры яе вывучэнні.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Сінонімы».<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Словы, аднолькавыя па гучанні, розныя па значэнні».<br>На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць паведамленне на тэму «Узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу навучэнцаў пры вывучэнні элементаў лексікалогіі». | выступленне з паведамленнем<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>выступленне з паведамленнем |
| 11. | Методыка вывучэння марфемнага складу слова і элементаў словаўтварэння | 8 | 8 | Прааналізаваць тэму вучэбнай праграмы па беларускай мове «Склад слова», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры яе вывучэнні.<br>Распрацаваць план-канспект урока беларускай мовы па тэме «Прыстаўка».<br>Распрацаваць план-канспект урока беларускай мовы па тэме «Суфікс».<br>На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць паведамленне на тэму «Выпрацоўка арфаграфічнага навыку на аснове засваення марфемнай будовы слова». | выступленне з паведамленнем<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>выступленне з паведамленнем |
| 12. | Методыка вывучэння марфалогіі | 8 | 8 | Прааналізаваць тэму вучэбнай праграмы па беларускай мове «Часціны мовы», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры яе вывучэнні.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Прыназоўнік» у 2 класе.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Займеннік як часціна мовы». | выступленне з паведамленнем<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>план-канспект ўрока бела- |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхтаваць паведамленне на тэму «Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах». | рускай мовы<br><br>выступленне з паведамленнем |
| 13. | Методыка навучання арфаграфіі | 8 | 8 | На аснове аналізу метадычнай літаратуры ахарактарызаваць розныя віды дыктантаў і скласці схему «Віды дыктантаў».<br>Распрацаваць план-канспект урока правядзення кантрольнага дыктанта ў 3 класе.<br>На аснове аналізу метадычнай літаратуры падрыхітаваць паведамленне на тэму «Методыка вывучэння слоў з цяжкімі арфаграмамі (слоўнікавых слоў)».<br>Падабраць практыкаванні для засваення навучэнцамі правапісу аднаго слоўнікавага слова на выбар | граф-схема<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>выступленне з паведамленнем<br><br>набор арфаграфічных практыкаванняў |
| 14. | Методыка вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах | 6 | 6 | Прааналізаваць раздзел вучэбнай праграмы па беларускай мове «Сказ», вызначыць патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў, якія фарміруюцца пры вывучэнні раздзела.<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Тыпы сказаў».<br>Распрацаваць план-канспект урока па тэме «Аднародныя члены сказа». | выступленне з паведамленнем<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы<br><br>план-канспект ўрока беларускай мовы |
| Усяго | | 94 | 98 | | |

## Прыкладны пералік пытанняў да экзамену

1. Сувязь методыкі выкладання беларускай мовы з філасофіяй, логікай, мовазнаўствам, псіхалогіяй, педагогікай.
2. Сучасныя тэарэтычныя падыходы ў методыцы выкладання беларускай мовы.
3. Сістэма паняццяў і катэгорый методыкі выкладання беларускай мовы.
4. Гістарычныя этапы развіцця методыкі выкладання беларускай мовы.
5. Роля Якуба Коласа ў станаўленні методыкі выкладання беларускай мовы.
6. Лінгвадыдактычныя прынцыпы навучання беларускай мове.
7. Класіфікацыі метадаў навучання беларускай мове. Характарыстыка асноўных метадаў навучання беларускай мове.
8. Характарыстыка асноўных прыёмаў навучання беларускай мове.
9. Значэнне беларускай мовы ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Месца вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў тыпавых вучэбных планах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.
10. Прынцыпы пабудовы праграмы па беларускай мове, асноўныя раздзелы, іх структура і ўзаемасувязь.
11. Вучэбна-метадычны комплекс па беларускай мове. Характарыстыка яго асноўных і дадатковых кампанентаў.
12. Асаблівасці вывучэння беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання.
13. Стратэгіі авалодання беларускай мовай як другой і камунікатыўныя стратэгіі, якія засвойваюцца навучэнцамі пачатковых класаў.
14. Характарыстыка асноўных форм навучання беларускай мове.
15. Тыпы ўрокаў беларускай мовы, іх структурныя кампаненты.
16. Патрабаванні да ўрокаў беларускай мовы.
17. Наглядныя дапаможнікі, тэхнічныя і электронныя сродкі навучання беларускай мове.
18. Арганізацыя паўтарэння на ўроках беларускай мовы. Структура, змест, асаблівасці арганізацыі ўрокаў падагульнення вывучанага матэрыялу.
19. Віды кантролю на ўроках беларускай мовы.
20. Формы кантролю на ўроках беларускай мовы.
21. Адукацыйная, стымулюючая, кантрольная і выхаваўчая функцыі ацэнкі на ўроках беларускай мовы.
22. Асаблівасці арганізацыі безадзнакавага навучання на ўроках беларускай мовы ў 1–2 класах.
23. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў на ўроках беларускай мовы ў 3–4 класах.

24. Віды кантрольных пісьмовых работ па беларускай мове. Нормы ацэнкі гэтых відаў работ.

25. Нормы ацэнкі вуснага адказу, навучальных пісьмовых работ (класных і дамашніх) на ўроках беларускай мовы.

26. Адукацыйнае і практычнае значэнне, прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння фанетыкі і графікі ў пачатковых класах.

27. Задачы і змест, метады і прыёмы вывучэння фанетыкі і графікі ў пачатковых класах.

28. Методыка працы над гукамі, літарамі, складам, націскам пры вывучэнні раздзела «Гукі і літары» ў 2 класе.

29. Развіццё мыслення і маўлення навучэнцаў пры вывучэнні асноў фанетыкі і графікі.

30. Прычыны ўзнікнення, прыёмы папярэджання і выпраўлення арфаэпічных і акцэнталагічных памылак у маўленні навучэнцаў.

31. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.

32. Задачы і змест, метады і прыёмы вывучэння элементаў лексікалогіі ў пачатковых класах.

33. Методыка знаёмства з адназначнымі і мнагазначнымі словамі, з прамым і пераносным значэннем слова, з сінонімамі, антонімамі ў пачатковых класах.

34. Узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу, развіццё лагічнага мыслення навучэнцаў пры вывучэнні элементаў лексікалогіі.

35. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.

36. Задачы і змест, сістэма вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.

37. Метады і прыёмы вывучэння марфемнага складу слова ў пачатковых класах.

38. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах.

39. Задачы і змест вывучэння марфалогіі ў пачатковых класах.

40. Сістэма вывучэння назоўніка ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў з родам, лікам, склонам назоўнікаў.

41. Сістэма вывучэння прыметніка ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў са змяненнем прыметнікаў па родах, ліках, склонах.

42. Сістэма вывучэння дзеяслова ў пачатковых класах. Методыка азнаямлення вучняў з формамі часу дзеяслова, са змяненнем дзеясловаў па асобах і ліках.

43. Асаблівасці вывучэння займенніка ў пачатковых класах. Фарміраванне культуры маўлення навучэнцаў пры знаёмстве з асабовымі займеннікамі.

44. Методыка працы над прыназоўнікамі і злучнікамі ў пачатковых класах.

45. Мэты, задачы, змест, прынцыпы навучання арфаграфіі ў пачатковых класах.

46. Сутнасць арфаграфічнага навыку, умовы яго выпрацоўкі. Сутнасць і структура арфаграфічнага дзеяння.

47. Выпрацоўка ўмення вызначаць арфаграфічную задачу. Паслядоўнасць вырашэння арфаграфічнай задачы.

48. Методыка працы над арфаграфічным правілам. Фарміраванне ў вучняў умення прымяняць арфаграфічныя правілы на пісьме.

49. Прыёмы выпрацоўкі арфаграфічных уменняў і навыкаў.

50. Прыёмы і формы развіцця арфаграфічнай пільнасці.

51. Віды арфаграфічных практыкаванняў, методыка іх правядзення.

52. Алгарытмізацыя ў навучанні арфаграфіі. Алгарытм спісвання, Алгарытм пісьма пад дыктоўку.

53. Методыка вывучэння слоў з цяжкімі арфаграмамі (слоўнікавых слоў).

54. Прычыны арфаграфічных памылак. Папярэджанне арфаграфічных памылак у пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў.

55. Арганізацыя працы над арфаграфічнымі памылкамі. Структура ўрока працы над памылкамі.

56. Значэнне і прыватнаметадычныя прынцыпы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.

57. Задачы і змест, сістэма вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі ў пачатковых класах.

58. Методыка фарміравання асноўных сінтаксічных паняццяў у навучэнцаў пачатковых класаў.

59. Методыка працы над пунктаграмамі. Умовы эфектыўнага засваення сінтаксічных і пунктуацыйных паняццяў навучэнцамі пачатковых класаў.

60. Метады і прыёмы вывучэння сінтаксісу і пунктуацыі.

## Прыклады кампетэнтнасна-арыентаваных заданняў

***1) Настаўнік плануе правядзенне навучальнага пісьмовага пераказу ў 3 класе падчас вывучэння раздзела «Тэкст».***

*Прааналізуйце наступны тэкст і апорныя словы з вучэбнага дапаможніка па беларускай мове:*

55. Прачытайце тэкст.

**Адказны за прыроду**

Алёшка вучыцца ў трэцім класе. Яго прызначылі адказным за прыроду. Аднак ніякай прыроды ў класе няма.

Ды хлопчык знайшоў сабе работу. Не ўсе птушкі ляцяць у вырай. Вераб'і, сініцы, снегіры застаюцца зімаваць. Некаторыя гінуць.

Алёшка рашыў дзейнічаць. Ён стварыў сталоўку для птушак. На сасне і бярозе прыладзіў дошчачкі на шнурках. На дошчачкі хлопчык сыпаў хлебныя крошкі, крупы.

Птушкі прыпісаліся да сталоўкі. Кожны дзень дошчачкі чыстыя *(Паводле І. Навуменкі)*.

*Р/М Вусна перакажыце тэкст па плане, выкарыстаўшы наступныя словы і спалучэнні слоў:*

вучыцца ў трэцім класе, прызначылі, прыроды няма;
знайшоў работу, ляцяць у вырай, застаюцца зімаваць, гінуць;
рашыў дзейнічаць, стварыў сталоўку, прыладзіў дошчачкі, сыпаў крошкі, крупы;
прыпіса́ліся да сталоўкі, чыстыя.

1. Прапануйце настаўніку пытанні для аналізу зместу тэксту, якія трэба выкарыстаць у гутарцы з навучэнцамі.
2. Прааналізуйце апорныя словы і словазлучэнні і адкажыце, якія вядомыя навучэнцам 3-га класа арфаграмы сустрэліся ў гэтых словах.
3. Арыентуючыся на вылучаныя арфаграмы, прапануйце прыёмы працы на этапе арфаграфічнай падрыхтоўкі вучняў да напісання пераказу.

***2) Настаўнік плануе правядзенне кантрольнага дыктанта ў 2 класе.***

*Прааналізуйце тэкст дыктанта:*

Бабуля і ўнучка

Каця часта ездзіць у госці да бабулі Валі. Яна жыве ў вёсцы. У бабулі ёсць каза Зорка. Каця даглядае яе. Кожную раніцу бабуля частуе ўнучку смачным малачком. (30 слоў)

1. Назавіце вядомыя вучням другога класа тыпы арфаграм, што сустрэліся ў тэксце.
2. Вызначце мэту ўрока і распрацуйце план урока правядзення кантрольнага дыктанта.
3. Раскажыце алгарытм пісьма пад дыктоўку, які павінны захоўваць навучэнцы падчас дыктанта.

***3) На ўроку па тэме «Даданыя члены сказа» ў 3 класе настаўнік плануе працу па складанні навучэнцамі алгарытму вызначэння сувязі слоў у сказе.***

*Прааналізуйце наступнае практыкаванне з вучэбнага дапаможніка па беларускай мове:*


**130.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння сувязі слоў у сказе.

1. Знаходзім у сказе … . Падкрэсліваем яго … .

што?
*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

2. Ставім пытанне ад дзейніка да … . Падкрэсліваем выказнік … .

што зрабіў?
*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

3. Па пытаннях знаходзім даданыя члены сказа, якія паясняюць … .

які?
*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

4. Па пытаннях знаходзім даданыя члены сказа, якія паясняюць … .

куды?
*На зямлю апусціўся асенні вечар.*

Намалюйце схему сказа, разбор якога зрабілі.

1. На аснове матэрыялу практыкавання прапануйце настаўніку два варыянты арганізацыі працы навучэнцаў па складанні ўказанага алгарытму.
2. Якія сродкі нагляднасці вы парэкамендуеце настаўніку выкарыстаць падчас складання алгарытму?
3. Пры вызначэнні галоўных членаў сказа вучаніца дапусціла памылку:

*У парку дзеці ўбачылі прыгожыя дубы.*

Чым выклікана падобная памылка? Якія прыёмы працы вы можаце прапанаваць для папярэджання падобных памылак вучняў?

***4) Настаўніку неабходна падрыхтаваць план-канспект урока па тэме «Часціны мовы» ў 3 класе.***

*Прааналізуйце матэрыялы вучэбнага дапаможніка па беларускай мове па адпаведнай тэме:*

ЧАСЦІНЫ МОВЫ

**74.** Прачытайце словы. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнне з апорай на малюнкі.

Сонейка, хмара, яркае, схавалася, за, выглянула, з-за, вялікая.



схавалася **за** хмару — выглянула **з-за** хмары

Размяркуйце словы ў тры слупкі:

словы — назвы прадметаў
...

словы — назвы прымет прадметаў
...

словы — назвы дзеянняў прадметаў
...

На якія пытанні адказваюць словы кожнай групы?
Якія словы з практыкавання не называюць прадметаў, прымет і дзеянняў? Як яны называюцца?

**75.** Са слоў кожнай групы паспрабуйце скласці сказы. Якія словы нельга аб'яднаць у сказ? Якім словам трэба дапоўніць словы другой групы, каб атрымаўся сказ?

1. Дзяўчынкі, прыгожую, спяваюць, песню.
2. Хлопчыкі, валейбол, гуляюць.
3. На, пад, перад, за, між.

Запішыце сказы і разбярыце іх па членах сказа. Якімі членамі сказа з'яўляюцца словы — назвы прадметаў, прымет, дзеянняў?

> Словы ў мове падзяляюцца на вялікія групы — **часціны мовы**. Кожная часціна мовы мае сваё значэнне, адказвае на свае пытанні, мае свае прыметы, выконвае сваю ролю ў сказе. Назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыназоўнік — гэта часціны мовы.

**76.** Разгледзьце схему «Часціны мовы» на форзацы 1. Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Словы, якія абазначаюць прадметы, — гэта ... .
Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, — гэта ... .
Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, — гэта ... .

1. Вызначце, якія адукацыйныя задачы неабходна вырашыць настаўніку на ўроку.

2. Адкажыце, на якія адрозненні самастойных часцін мовы ад службовых неабходна звярнуць ўвагу пры выкананні Пр. 74, Пр. 75.

3. Пры працы на ўроку вучням неабходна было вызначыць, якімі часцінамі мовы з’яўляюцца словы *белізна, белы, пабяліць*.

Адзін з вучняў выканаў заданне так: *белізна – прыметнік, белы – прыметнік, пабяліць – дзеяслоў.*

У чым прычына памылкі вучня? Якую працу па папярэджанні падобных памылак трэба праводзіць настаўніку?

***5) Настаўніку неабходна распрацаваць падагульняльны ўрок па тэме «Часціны мовы» ў 3 класе.***

*Прааналізуйце адпаведныя матэрыялы вучэбнага дапаможніка па беларускай мове:*

**Успомніце**

З якімі часцінамі мовы вы пазнаёміліся?

**219.** Прачытайце. Што аб'ядноўвае словы ў кожнай групе?

1. Чорны, чарната, чарнець.
2. Весяліцца, вясёлы, весялосць.
3. Холад, халодны, халадаць.

Падзяліце словы на тры групы па іншай прымеце. Запішыце іх у тры слупкі. Што аб'ядноўвае словы ў кожным слупку?

Дапоўніце кожны слупок слоў уласнымі прыкладамі.

**220.** Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Запішыце астатнія словы кожнай групы. Вызначце прымету, якая аб'ядноўвае словы ў кожнай групе.

1. Птушка, песня, радасць, конь, печ.
2. Акуляры, дзверы, барацьба, штаны, канікулы.
3. Вясёлы, добрае, сонечны, дзянёк, прыгожая.
4. Бяжыць, слухаў, думае, глядзіць, смяецца.

Абазначце канчаткі назоўнікаў і прыметнікаў.

**221.** Прачытайце спалучэнні слоў. Выпішыце тыя з іх, якія напісаны па-беларуску.

Залаты медаль, золотая медаль; белая гусь, белый гусь; зелёный салат, зялёная салата; широкая степь, шырокі стэп; доўгі цень, длинная тень.

Вызначце род назоўнікаў.

**?!** Словы якой часціны мовы дапамаглі гэта зрабіць?

**222.** Прачытайце сказы. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы.

1. У руках у таты была бліскучая **піла** (…). Таня **піла** (…) чай з прыгожага кубачка.

2. Тонкія **вусны** (…) рабілі твар настаўніцы крыху строгім. На ўроку дзеці рабілі **вусны** (…) пераказ тэксту.

3. Бабуля **стала** (…) каля пліты і пачала смажыць бліны. Кошка ціха падышла да **стала** (…).

4. Снежань, студзень, **люты** (…) — зімовыя месяцы. Трэба дапамагаць птушкам і жывёлам у **люты** (…) мароз.

5. У кветніку **Лілі** (…) растуць прыгожыя ружы. Летам дзеці часта **лілі** (…) ваду пад пладовыя дрэвы.

Спішыце два сказы на выбар.

**ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ**

*Адкажыце на пытанні*

1. Што такое назоўнік?
2. Як змяняюцца назоўнікі?
3. Як вызначыць род назоўнікаў?
4. Чаму ў назоўніка *паводзіны* нельга вызначыць род?
5. Што такое прыметнік?
6. Як змяняюцца прыметнікі?
7. Як вызначыць род і лік прыметнікаў?
8. Што такое дзеяслоў?
9. Як змяняюцца дзеясловы?
10. У форме якога часу дзеясловы змяняюцца па родах?
11. Як пішацца *не* з дзеясловамі?
12. Якую ролю ў сказе часцей выконваюць назоўнікі, якую — прыметнікі, а якую — дзеясловы?

*Творчая хвілінка*

Уявіце, што ў класе праводзіцца канферэнцыя на тэму «Часціны мовы ў беларускай мове». Выберыце любую з вывучаных часцін мовы і падрыхтуйце паведамленне з прыкладамі на тэму «Што я ведаю пра назоўнік (прыметнік, дзеяслоў)». Карыстайцеся інфармацыяй на форзацах вучэбнага дапаможніка.

1. Вызначце, якія адукацыйныя задачы неабходна вырашыць настаўніку на ўроку.

2. Распрацуйце план урока, выкарыстаўшы заданні вучэбнага дапаможніка і розныя формы арганізацыі работы вучняў.

3. Якія сродкі нагляднасці вы парэкамендуеце выкарыстаць настаўніку на ўроку?

# Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| № п/п | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1 | 10 (дзесяць) балаў, залічана | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі ( у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны выклад адказаў на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>выражаная здольнасць самастойна і творча рашаць складаныя праблемы і нестандартныя сітуацыі;<br>поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай дысцыпліне, модулі;<br>уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;<br>творчая, самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў; |
| 2 | 9 (дзевяць) балаў, залічана | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі ( у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна і творча рашаць складаныя праблемы і нестандартныя сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 3 | 8 (восем) балаў, залічана | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі ў аб’ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі ( у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; |

| | | |
|---|---|---|
| | | здольнасць самастойна рашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 4 | 7 (сем) балаў, залічана | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі ( у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>свабоднае валоданне тыповымі рашэннямі ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 5 | 6 (шэсць) балаў, залічана | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя вывады і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыповыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |

| | | |
|---|---|---|
| 6 | 5 (пяць) балаў, залічана | дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць вывады;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыповыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў |
| 7 | 4 (чатыры) балы, залічана | дастатковыя аб'ём ведаў ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка рашаць стандартныя (тыповыя) задачы;<br>уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім ацэнку;<br>работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў |
| 8 | 3 (тры) балы, не залічана | недастаткова поўны аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных, лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 9 | 2 (два) балы, не залічана | фрагментарныя веды знания ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>няўменнне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, модуля, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 10 | 1 (адзін) бал, не залічана | адсутнасць ведаў і кампетэнцый у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны |

## Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі, КСР і СР

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Паведамленне** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта;<br>– тэма раскрыта часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– тэма раскрыта часткова: не больш за 3 заўвагі;<br>– тэма не раскрыта: 4 і больш заўваг |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай і метадычнай літаратуры | – аб'ём навуковай і метадычнай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай і метадычнай літаратуры недастатковы: не больш за 2 заўвагі;<br>– аб'ём навуковай і метадычнай літаратуры недастатковы: 3 заўвагі;<br>– аб'ём навуковай і метадычнай літаратуры недастатковы: 4 і больш заўваг; |
| Верагоднасць інфармацыі паведамлення (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, ёсць спасылкі на першакрыніцы;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным патрабаванні з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па двух патрабаваннях з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па ўсіх патрабаваннях |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя даныя і факты служаць для абгрунтавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя даныя і факты служаць для абгрунтавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– прыведзеныя даныя і факты служаць для абгрунтавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова: 3 і больш заўваг;<br>– прыведзеныя даныя і факты не служаць для абгрунтавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў |
| **Апорны канспект** | |
| Адпаведнасць канспекта плану зместу крыніцы | – канспект адпавядае плану зместу;<br>– канспект часткова адпавядае плану зместу: не больш за 2 заўвагі;<br>– канспект часткова адпавядае плану зместу: 3 і больш заўваг;<br>– канспект не адпавядае плану зместу |
| Адлюстраванне ў канспекце асноўных палажэнняў крыніцы і наяўнасць вывадаў | – асноўныя палажэнні адлюстраваны, вывады прадстаўлены;<br>– асноўныя палажэнні адлюстраваны, вывады не прадстаўлены;<br>– асноўныя палажэнні адлюстраваны часткова, вывады часткова прадстаўлены;<br>– асноўныя палажэнні не адлюстраваны, вывады не прадстаўлены |
| Яснасць, лаканічнасць выкладу | – выклад ясны і лаканічны;<br>– выклад мае не больш за 2 заўвагі па ўказаных параметрах;<br>– выклад мае не больш за 3 заўвагі па ўказаных параметрах;<br>– па ўказаных параметрах выклад мае 4 і больш заўваг |
| **Гласарый** | |
| Дакладнасць інфармацыі | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае не больш за 2 заўвагі;<br>– інфармацыя мае 3 і больш заўваг; |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| | – інфармацыя недакладная ў поўным аб'ёме |
| Верагоднасць інфармацыі | – інфармацыя верагодная;<br>– інфармацыя мае не больш за 2 заўвагі;<br>– інфармацыя мае 3 і больш заўваг;<br>– інфармацыя неверагодная |
| Адлюстраванне ў рабоце кантэксту, у якім можа быць выкарыстаны дадзены тэрмін | – кантэкст адлюстраваны ў рабоце;<br>– кантэкст не поўнасцю адлюстраваны ў рабоце: не больш за 2 заўвагі;<br>– кантэкст не поўнасцю адлюстраваны ў рабоце: 3 і больш заўваг;<br>– кантэкст у рабоце не адлюстраваны |
| **Анатацыя артыкула** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта;<br>– тэма раскрыта часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– тэма раскрыта часткова: не больш за 3 заўвагі;<br>– тэма не раскрыта: 4 і больш заўваг |
| Самастойнасць меркаванняў і аргументацыі | – прадстаўлена аргументацыя свайго меркавання з апорай на факты грамадскага жыцця і асабісты вопыт;<br>– дадзена аргументацыя свайго меркавання са слабай апорай на факты грамадскага жыцця і асабісты вопыт;<br>– слаба аргументавана ўласнае меркаванне з мінімальнай апорай на факты грамадскага жыцця і асабісты вопыт; або яго адсутнасць;<br>– не аргументавана ўласнае меркаванне |
| Яснасць, лаканічнасць выкладу | – выклад ясны і лаканічны;<br>– выклад мае не больш за 2 заўвагі па ўказаных параметрах;<br>– выклад мае не больш за 3 заўвагі па ўказаных параметрах;<br>– па ўказаных параметрах выклад мае 4 і больш заўваг |
| **План-канспект урока (фрагмент урока)** | |
| Адпаведнасць тэме і мэтам урока | – адпавядае тэме і мэтам урока ў поўным аб'ёме;<br>– у цэлым адпавядае тэме і мэтам урока, ёсць не больш за 2 недакладнасці;<br>– у цэлым адпавядае тэме і мэтам урока, ёсць не больш за 4 недакладнасці;<br>– адпавядае тэме і мэтам урока толькі часткова |
| Дакладнасць структуры | – структура ўрока поўнасцю адпавядае выбранаму тыпу;<br>– структура ўрока не поўнасцю адпавядае выбранаму тыпу;<br>– структура ўрока не адпавядае выбранаму тыпу |
| Ступень самастойнасці пры распрацоўцы | – план-канспект (фрагмент) урока распрацаваны самастойна;<br>– план-канспект (фрагмент) урока распрацаваны па аналогіі з прааналізаваным ўзорным урокам;<br>– план-канспект (фрагмент) урока распрацаваны недастаткова самастойна<br>– |
| **Бібліяграфічны спіс** | |
| Паўната | – літаратурныя крыніцы ў спісе поўнасцю ахопліваюць заяўленую тэму;<br>– літаратурныя крыніцы ў спісе ахопліваюць заяўленую тэму ў дастатковым аб'ёме;<br>– літаратурныя крыніцы ў спісе часткова ахопліваюць заяўленую тэму |
| Дакладнасць | – усе літаратурныя крыніцы ў спісе адпавядаюць заяўленай тэме;<br>– літаратурныя крыніцы ў спісе ў цэлым адпавядаюць заяўленай тэме: ёсць не больш за 2 недакладнасці;<br>– літаратурныя крыніцы ў спісе часткова не адпавядаюць заяўленай тэме: ёсць больш за 2 недакладнасці |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| Актуальнасць | – усе літаратурныя крыніцы ў спісе з'яўляюцца актуальнымі;<br>– не ўсе літаратурныя крыніцы ў спісе з'яўляюцца актуальнымі |
| **Картатэка план-канспектаў урокаў** | |
| Паўната | – картатэка адлюстроўвае ўсе наяўныя ў навукова-метадычных часопісах за пэўны перыяд узорныя план-канспекты ўрокаў;<br>– картатэка адлюстроўвае асноўныя ўзорныя план-канспекты ўрокаў, змешчаныя ў навукова-метадычных часопісах за пэўны перыяд;<br>– картатэка адлюстроўвае не ўсе наяўныя ў навукова-метадычных часопісах за пэўны перыяд узорныя план-канспекты ўрокаў |
| Актуальнасць | – усе ўказаныя ў картатэцы план-канспекты ўрокаў з'яўляюцца актуальнымі для адукацыйнага працэсу на сучасным этапе;<br>– не усе ўказаныя ў картатэцы план-канспекты ўрокаў з'яўляюцца актуальнымі для адукацыйнага працэсу на сучасным этапе |
| **Зводная (апорная) табліца** | |
| Кампактнасць табліцы і лаканічнасць запісаў | – кампактна і лаканічна;<br>– мае заўвагі па кампактнасці і лаканічнасці: не больш за 2 заўвагі;<br>– мае заўвагі па кампактнасці і лаканічнасці: не больш за 4 заўвагі;<br>– мае мноства заўваг па кампактнасці і лаканічнасці |
| Указанне вывучаемых аб'ектаў | – усе аб'екты ўказаны;<br>– аб'екты ўказаны часткова: адсутнічае не больш за 2 аб'екты;<br>– аб'екты ўказаны часткова: адсутнічае не больш за 4 аб'екты;<br>– аб'екты ўказаны часткова: адсутнічае 5 і больш аб'ектаў |
| Лагічныя сувязі табліцы | – аб'екты табліцы лагічна звязаны;<br>– логіка парушана часткова: 1 заўвага;<br>– логіка парушана часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– аб'екты табліцы лагічна не звязаны |
| **Граф-схема** | |
| Выдзяленне асноўных паняццяў | – асноўныя паняцці выдзелены поўнасцю;<br>– асноўныя паняцці выдзелены часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– асноўныя паняцці выдзелены часткова: 3 і больш заўваг;<br>– асноўныя паняцці не выдзелены |
| Вызначэнне сэнсавых і прычынна-выніковых сувязей | – сэнсавыя і прычынна-выніковыя сувязі вызначаны;<br>– сэнсавыя і прычынна-выніковыя сувязі вызначаны часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– сэнсавыя і прычынна-выніковыя сувязі вызначаны часткова: 3 і больш заўваг;<br>– сэнсавыя і прычынна-выніковыя сувязі не вызначаны |
| Вызначэнне ўзаемасувязей блокаў паняццяў | – узаемасувязі блокаў паняццяў вызначаны ў поўным аб'ёме;<br>– узаемасувязі блокаў паняццяў вызначаны часткова: не больш за 2 заўвагі;<br>– узаемасувязі блокаў паняццяў вызначаны часткова: 3 і больш заўваг;<br>– узаемасувязі блокаў паняццяў не вызначаны |
| **Набор практыкаванняў** | |
| Паўната | – падабраныя практыкаванні поўнасцю ахопліваюць заяўленую тэму;<br>– падабраныя практыкаванні ахопліваюць заяўленую тэму ў дастатковым аб'ёме;<br>– падабраныя практыкаванні часткова ахопліваюць заяўленую тэму |
| Дакладнасць | – усе падабраныя практыкаванні адпавядаюць заяўленай тэме;<br>– падабраныя практыкаванні ў цэлым адпавядаюць заяўленай тэме: ёсць не больш за 2 недакладнасці;<br>– падабраныя практыкаванні часткова не адпавядаюць заяўленай тэме: |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| | ёсць больш за 2 недакладнасці |
| Пасільнасць | – узровень складанасці прапанаваных практыкаванняў адпавядае псіхолага-ўзроставым асаблівасцям навучэнцаў;<br>– узровень складанасці прапанаваных практыкаванняў у цэлым адпавядае псіхолага-ўзроставым асаблівасцям навучэнцаў: ёсць не больш за 2 недакладнасці;<br>– узровень складанасці прапанаваных практыкаванняў не адпавядае псіхолага-ўзроставым асаблівасцям навучэнцаў: ёсць больш за 2 недакладнасці |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Беларуская мова» | Беларускага і рускага мовазнаўства | Змест праграмы ўзгоднены на стадыі распрацоўкі | Пратакол № 3 ад 19.09.2024 г. |
| «Методыка развіцця маўлення» | | | |
| «Методыка выкладання рускай мовы» | | | |
| «Методыка выкладання літаратурнага чытання» | | | |
| «Методыка навучання грамаце і каліграфія» | | | |

## Спіс рэкамендаванай літаратуры

1. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2020. – 264 с.
2. Образовательный стандарт начального образования // Пачатк. навучанне: сям'я, дзіцячы сад, шк. – 2019. – № 2. – С. 3–15.
3. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 2 кл. / В. І. Свірыдзенка, Н. У. Антонава. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 269 с.
4. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 3 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – 239 с.
5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова ў 4 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – 224 с.
6. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка : манаграфія / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 280 с.